

РАЗМОВА ПРА СУЧАСНАСЦЬ З ПАСЛОМ ІРАНА 8

ХРАМЫ МАЁЙ РАДЗІМЫ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛЮТАГА 2021 г. АЎТОРАК № 24 (29393)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Наша задача на 2021 год — прырасці па экспарце сельгаспрадукцыі на 4,3 % да ўзроўню 2020-га, што складзе крыху больш за 6 млрд долараў. Гэта вельмі вялікая сума, а за рынкі прыходзіцца змагацца ўсім, выкарыстоўваючы розныя маркетынгавыя інструменты і спосабы прасоўвання. Калі сёлета ўсё будзе добра з вытворчасцю і кан'юнктурай рынку, мы перасягнём гэтую мяжу. А да 2025 года запланаваны аб'ём у 7 млрд долараў, гэта значыць нам трэба за пяцігодку прырасці больш чым на 1 млрд».*

# ДЭТАЛЁВА І КАНЦЭПТУАЛЬНА



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў заключную нараду напярэдадні VI Усебеларускага народнага сходу па пытаннях яго падрыхтоўкі і правядзення.**

Работы на тры дні перад сходам застаецца яшчэ нямала, і яна будзе звязаная не толькі з выступленнямі, праектам рэзалюцыі УНС, але і з матэрыяламі галоўнага даклада, адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Гэта перш за ўсё абумоўлена вынікамі сацыялагічных даследаванняў, якія былі праведзены на працягу апошняга месяца, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта глыбокае вывучэнне настрояў у нашым грамадстве, бо рэпрэзентатыўнасць склала 10 тысяч чалавек, што ў дзесяць разоў больш, чым звычайна даследуюць сацыёлагі».

Апытанне праводзілася ў два этапы, паведаміў беларускі лідар. Першы вывучаў настроі гарадскога насельніцтва і ахопліваў тысячу чалавек. Другі этап уключыў больш шырокія слаі насельніцтва — ад жыхароў вёсак да мінчан.

СТАР. 2

# Светач — вёска кавальская



Павел ЕМЯЛЬЯНАЎ і Сяргей ЮСЦІНЕВІЧ працуюць кавалямі-зваршчыкамі ў фермерскай гаспадарцы «Белаграсэрвіс» Смаргонскага раёна, выконваюць эксклюзіўныя работы па заказах мясцовых жыхароў і гарадскіх улад — вароты і агароджы, рашоткі і казыркі ды іншую каваную прадукцыю з металу. Цэх, дзе працуюць Павел і Сяргей, знаходзіцца ў вёсцы Светач. Мастацкія вырабы майстроў можна сустрэць не толькі на вуліцах раённага цэнтра і суседніх гарадоў Гродзеншчыны і Міншчыны, але і ў самой сталіцы. Надзейныя і надзвычай прыгожыя ажурныя творы спецыялістаў са Светача аздабляюць нават храмы розных канфесій.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **НАК Беларусі атрымаў афіцыйнае запрашэнне на зімовыя Гульні ў Пекіне.**
- Мінпрацы: з гэтага года пачнецца перагляд падыходаў да адраснай дапамогі сем'ям з адным-двума дзецьмі.
- **Змяненні ў Працоўны кодэкс у частцы аддаленай работы плануюць распрацаваць сёлета.**
- Квартал электрадамоў плануюць пабудаваць у Івацэвічах.
- **«Аэрафлот» павялічвае колькасць рэйсаў з Масквы ў Мінск да пяці ў тыдзень.**
- Беларусь у 2020 годзе пачала пастаўкі сельгаспрадукцыі на 20 новых рынкаў.
- **Колькасць замежнікаў, якія навучаюцца ў Беларусі, за 5 гадоў павялічылася на 35 %.**

Размова па сутнасці

# ПРАЗ ПРЫЗМУ РЭАЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

### Менавіта так на праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на наступныя пяць гадоў глядзяць людзі ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны

**Праект праграмы развіцця нашай краіны на 2021 — 2025 гады будзе адной з галоўных тэм абмеркавання на VI Усебеларускім народным сходзе, які распачне сваю работу ужо паслязаўтра. Асноўныя палажэнні названай праграмы апублікаваныя ў шырокім доступе, іх абмяркоўваюць і ў калектывах, і падчас дыялогавых пляцовак, што праводзіліся па ўсёй краіне.**

«Звязда» таксама вырашыла далучыцца да абмеркавання. Паколькі ў праекце праграмы асаблівая ўвага аддаецца развіццю рэгіёнаў, мы запрасілі да нашай віртуальнай размовы людзей з усіх абласцей нашай краіны, якіх можна лічыць спецыялістамі ў той ці іншай сферы нашага жыцця. Кожнаму з іх прапанавалі параразважаць над пэўнай вытрымкай з праекта, якая датычыцца іх прафесійнай дзейнасці або жыццёвай пазіцыі.

Атрымалася, на наш погляд, цікава. Бо кожны гаварыў пра сваё — пра тое, чым жыве, аб чым клапоціцца. Зрэшты, вось з такога прыватнага, асабістага клопату і ствараецца наш адзіны, агульны для ўсіх клопат — каб жыццё ў нашай любімай краіне станавілася лепшым.

СТАР. 4—5

ISSN 1990 — 763X

# ДЭТАЛЁВА І КАНЦЭПТУАЛЬНА

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар.)***

«Нам вельмі важна гэта было, асабліва для мяне, бо выступаць на Усебеларускім народным сходзе, планаваць нешта, не ведаючы глыбінных настрояў у грамадстве, вельмі складана», — дадаў Прэзідэнт.

Матэрыялы даследавання абсалютна аб'ектыўныя, запэўніў ён. «Былі задзейнічаны замежныя сацыялагічныя службы, яны будуць падводзіць вынікі, каб не было падазрэнняў. І нашы працавалі, і дзяржаўныя, і прыватныя сацыялагічныя арганізацыі. Таму, я думаю, аб'ектыўнасць будзе самая высокая, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я гэта кажу зараз для таго, каб падзякаваць нашым людзям. Мяне інфармавалі людзі, якія даследаваннямі займаліся, валанцёры, пра настроі людзей. Нашы людзі проста малайцы. Я абяцаў ананімнасць, адразу іх паперэджвалі пра гэта. Вельмі многія проста рукой махалі: «Запішыце наша прозвішча, пакажыце Прэзідэнту, што гэта маё прозвішча і вось маё меркаванне».

Пры гэтым ананімнасць строга захоўвалася, запэўніў кіраўнік дзяржавы. Даследаванне будзе мець вялікі ўплыў на выпрацоўку праграмы на будучы рух нашай краіны, падкрэсліў ён.

На нарадзе ў Палацы Незалежнасці былі дэталёва прааналізаваныя ўсе аспекты Усебеларускага народнага сходу, а таксама закранутыя канцэптуальныя пытанні матэрыялаў форуму.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## У тэму:

# «Асноўнае патрабаванне — захаванне канфідэнцыяльнасці і ананімнасці»

### Аб згаданым на нарадзе ў Прэзідэнта сацапытанні расказалі спецыялісты, якія мелі непасрэднае дачыненне да яго правядзення

**Аляксандр ПАСТАЛОЎСКІ, вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ:**

— Мы ажыццяўлялі кансультацыйную дапамогу ў методыцы і метадалогіі арганізацыі сацыялагічнага даследавання напярэдадні Усебеларускага народнага сходу. Асноўнае патрабаванне было — захаванне канфідэнцыяльнасці і ананімнасці. Ніякія персанальныя звесткі рэспандэнтаў нідзе не ўказваліся, уся інфармацыя паступала ў абагульненым выглядзе. Методыка была абраная «твар да твару» з рэспандэнтам, час запаўнення анкеты складаў каля 15—20 хвілін.

Людзі з цікаўнасцю бралі ўдзел у даследаванні, пытанні, якія былі ў інструментарыі, выклікалі непадробны інтарэс. Увогуле, сацыялогія — гэта форма зваротнай сувязі паміж грамадствам і дзяржавай. Людзі цудоўна разумелі значнасць даследавання і падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне.

Мясцовая вертыкаль не ўмешвалася ў правядзенне даследавання, што дазваляе заяўляць пра яго неангажаванасць.

**Старшыня прафсаюзнай арганізацыі ААТ «Белінвестбанк» Сяргей МОДЗІН:**

— Нас запрасілі дапамагчы правесці апытанне па ўсёй краіне. Адпаведна, ва ўсе абласныя, раённыя цэнтры выязджалі прадстаўнікі, якія прапаноўвалі запоўніць анкеты. Выпадковым чынам выбіралі прадпрыемствы рознага гаспадарчага профілю па адным-два ў раёне: заводы, установы, сельскагаспадарчыя арганізацыі. Каб сабраць людзей у час, калі яны не занятыя работай, дамаўляліся з адміністрацыяй. Атрымлівалася апытаць ад 20 да 100 чалавек з кожнага калектыву. На некаторых прадпрыемствах рабілі гэта ў два этапы. Прапаноўвалі людзям запоўніць ананімную анкету, потым анкеты збіралі, апячатвалі і завозілі ў цэнтр для апрацоўкі. Людзі ўспрынялі гэта з уздымам і адмоў ад удзелу ў апытанні было вельмі мала — адзінкі.

Грамадзяне дзякавалі за магчымасць выказацца, былі альтэрнатыўныя думкі, кожны адказваў, як лічыў патрэбным, без удзелу адміністрацыі або кіраўніцтва. У адпаведнасці з выбаркай паводле законаў сацыялогіі ў апытанні ўдзельнічала не больш за 10—20 працэнтаў звяна інжынерна-тэхнічнага складу, 80 і больш працэнтаў — работнікі з розных вытворчасцяў, гэта і з фермаў, і з палёў, і з цэхаў. Былі прадстаўлены і гарадскія, і сельскія жыхары.

**Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Кацярына РЭЧЫЦ:**

— Першай рэакцыяй людзей, што ўдзельнічалі ў апытанні, было лёгкае здзіўленне. Літаральна пазаўчора кіраўнік краіны сказаў, што магчыма да вас прыедуць сацыёлагі, запытаюць ваша меркаванне — і тут ужо да людзей падыходзяць і прапануюць удзельнічаць у такім апытанні. Людзей гэта, канешне, крыху здзівіляла, але для іх гонар, што іх думку запыталі. Яны прагладзелі пытанні, удумліва імкнуліся на гэтыя пытанні адказваць, разумеючы ўсю важнасць гэтых адказаў. І ўжо па завяршэнні апытання ў людзей было пачуццё ўдзячнасці, бо меркаванне кожнага важнае. Апытанне праводзілася не толькі ў абласных, але і раённых цэнтрах, аграгарадках, вёсках. Для людзей важна, што іх думку спыталі, і яна будзе пакладзена ў аснову нейкіх важных рашэнняў.

Прынцып ананімнасці захоўваўся на ўсіх этапах правядзення даследавання. Тыя, хто праводзіў апытанне, не ведалі, у якія цэнтры іх накіруюць. Яны не ведалі ні аб'ект даследавання, ні сваіх рэспандэнтаў. Гэта было для ўдзельнікаў апытання таксама нечаканасцю. Прынцып выпадковасці тут працаваў і для рэспандэнтаў таксама. Яны не ведалі, што ў нейкі дзень да іх прыедуць і спытаюць іхняе меркаванне. Пасля заканчэння апытання канверты адразу закрываліся. Ніхто з каманды, што праводзілі апытанне ў канкрэтнай арганізацыі, не бачыў адказы рэспандэнтаў. Усе анкеты кláліся ў асобны стос у перавернутым выглядзе.

Пры гэтым ніякіх асабістых звестак на анкетах рэспандэнты не ставілі. Сацыёлагі ўсіх папярэдзілі, каб ні прозвішчаў, ні імёнаў, ні подпісаў не ставілі. Не ўказвалі нават, які гэта раён, прадпрыемства — то-бок абсалютная ананімнасць на ўсіх этапах.

## Парламенцкая дыпламатыя

# ПАЛІТЫЧНЫ ДЫЯЛОГ, ЭКАНАМІЧНЫЯ СТАСУНКІ

**Учора старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля Качанава сустрэлася з паслом Узбекістана ў Беларусі Насірджанам Юсупавым, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне.**



Фота БелТА.

Наталля Качанава адзначыла істотную станоўчую дынаміку ў развіцці адносін нашай краіны з Узбекістанам у розных сферах. У цэнтры ўвагі суразмоўцаў былі пытанні гандлёва-эканамічнага, гуманітарнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што плённыя адносіны склаліся на высокім і вышэйшым узроўнях, у тым ліку і паміж прэзідэнтамі абедзвюх дзяржаў.

Знакавай падзеяй у адносінах краін стала адкрыццё пасольства Узбекістана ў Беларусі, што якасна паўплывала на стасункі афіцыйных Мінска і Ташкента. Напрыклад, з поспехам у 2019 годзе прайшоў першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана, падчас якога быў падпісаны шэраг перспектыўных пагадненняў. І такіх прыкладаў нямала. За адносна кароткі перыяд свайго знаходжання ў Мінску Насірджан Юсупаў заклаў трывалую базу для пашырэння як дзелавых, адукацыйных кантактаў, так і міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Пасол у размове з Наталляй Качанавай выказаў надзею на тое, што сёлета адбудзецца візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Ташкент. На яго погляд, парламентарыі могуць і павінны энергічна садзейнічаць умацаванню двухбаковага супрацоўніцтва, а іх сустрэчы і перагаворы — шлях да міжпарламенцкага ўзаемадзеяння на карысць народаў Узбекістана і Беларусі.

Насірджан Юсупаў, дарэчы, першы пасол Узбекістана ў нашай краіне, звярнуў увагу на рост тавараабароту і інвестыцый паміж краінамі, павелічэнне колькасці ўзбекскіх студэнтаў у Беларусі і іншыя станоўчыя факты. У цэлым краіны маюць вялікі патэнцыял для развіцця супрацоўніцтва.

— Я таксама думаю, што ў нас добрыя перспектывы, — выказала ўпэўненасць старшыня Савета Рэспублікі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Шкода ад беспарадкаў у Вашынгтоне перавысіла паўтрыльёна долараў



Заявы экс-прэзідэнта ЗША Дональда Трампа пра фальсіфікацыі на выбарах і наступныя масавыя беспарадкі каля будынка Капітолія ў Вашынгтоне абышліся падаткаплацельшчыкам у 519 мільёнаў долараў. Пра гэта паведаміла The Washington Post са спасылкай на запісы выдаткаў федэральных і мясцовых улад. «Выдаткі раслі штодня, паколькі дзяржаўныя структуры на ўсіх узроўнях былі вымушаныя задзейнічаць бюджэтныя сродкі для рэагавання на дзеянні Трампа і яго прыхільнікаў. Выдаткі ўключалі судовыя пошліны па дзясятках іскаў, узмацненне аховы членаў выбарчых камісій у адказ на пагрозы, аднаўленчыя работы пасля бунту 6 студзеня каля Капітолія», — адзначыла выданне. Так, на разгортванне сіл Нацыянальнай гвардыі ў Вашынгтоне было выдзелена 480 мільёнаў долараў, на забеспячэнне бяспекі пры інаўгурацыі новага прэзідэнта Джо Байдэна — 28 мільёнаў.

### Навукоўцы заявілі, што змена клімату магла прывесці да пандэміі COVID-19



Навукоўцы Кембрыджскага ўніверсітэта, Патсдамскага інстытута вывучэння кліматычных змяненняў і Гавайскага ўніверсітэта выявілі сувязь паміж зменай клімату ў Паўднёвым Кітаі і ўзнікненнем SARS-CoV-2 — віруса, які выклікаў пандэмію COVID-19. Гэта адзначаецца ў паведамленні Кембрыджскага ўніверсітэта. «Даследаванне выявіла глабальныя змены тыпу расліннасці ў паўднёвай кітайскай правінцыі Юньнань і прылеглых раёнах М'янмы і Лаоса за апошняе стагоддзе. Гэта стварыла прыдатнае асяроддзе для кажаноў, якія жывуць пераважна ў лясах», — сцвярджаецца ў паведамленні. Даследаванне паказала, што яшчэ 40 відаў кажаноў перамясцілася ў паўднёвую кітайскую правінцыю Юньнань у мінулым стагоддзі разам прыкладна з сотняй відаў каранавіруса, які пераносіцца імі.

### Каля 150 чалавек прапала без вестак пасля сыходжання ледавіка ў Індыі



Адбыўся прарыў ледавіка і разліў ракі Даўліганга ў штаце Утаракханд, што на поўначы Індыі, паведаміла ТАСС. Вялізныя масы лёду сышлі ўніз і выклікалі паводку ў высакагорных раёнах. Галоўны сакратар штата Утаракханд Ом Пракаш заявіў, што ў выніку паводкі ў акрузе Чамолі магло загінуць ад 100 да 150 чалавек. Большая частка зніклых без вестак — рабочыя гідраэлектрастанцыі «Рышыганга», на якую прыйшоўся асноўны ўдар стыхіі. Пры гэтым 20 работнікаў затрымаліся ўнутры тунэля на адной з плацін. Суседні штат Утар Прадэш увёў рэжым павышанай гатоўнасці да паводкі ў шэрагу раёнаў. «Я ўвесь час сачу за сумнай сітуацыяй. Індыя падтрымлівае Утаракханд, краіна моліцца за бяспеку кожнага», — запісаў у Twitter індыйскі прэм'ер-міністр Нарэндра Модзі.

Добрая навіна

# НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ АДНАВІЛІ МОСТ ЦЕРАЗ ПЦІЧ

**На Гомельшчыне на будучую пяцігодку стаіць задача ўвесці ў эксплуатацыю каля 40 мастоў. Ужо сёлета плануецца адкрыць новы мост цераз раку Дняпро ў Рагачове. Між тым дзякуючы адкрыццю пасля маштабнай рэканструкцыі моста цераз раку Пціч удалося вырашыць важную сацыяльную і эканамічную задачу на паўночным захадзе рэгіёна. Так, цяпер цалкам адноўлена транспартная сувязь райцэнтра Акцябрскі з зарэчнай зонай раёна. Новы мост — гэта яшчэ і адноўленая транспартная сувязь палескіх раёнаў Гомельшчыны і Брэстчыны.**



Жалезабетонны 12-пралётны мост паблізу вёскі Ражаноў Акцябрскага раёна размешчаны на аўтамабільнай дарозе Акцябрскі — Капцэвічы. Ён злучае райцэнтр з сельскімі Саветамі зарэчнай зоны. Мост пабудавалі ў 1972-м. Капітальнае збудаванне адслужыла амаль 40 гадоў і на сёння ўстарэла: часткова разбурыўся бетон, парушылася герметычнасць швоў, пайшлі каразійныя расколіны, дарожнае палатно таксама стала непрыдатнае. Гэтыя дэфекты не дазвалялі забяспечваць бяспеку пасажыраў і транспарту. Мост зачынілі. Ролю часовай пераправы цераз Пціч выконваў драўляны аб'язны мост. Яго ўзвядзенне забяспечыў Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння МНС Беларусі. Праўда, па часовай пераправе маглі рухацца толькі пешаходы, веласіпедысты і легкавікі, не дапускаўся грузавы транспарт.

Частку рамонтных работ на аварыйным жалезабетонным збудаванні правялі адразу, у 2011 годзе. Але з-за адсутнасці фінансавання аб'ект замарозілі. Да пытання аб рэканструкцыі моста ў Акцябрскім раёне вярнуліся два гады таму. У дзяржпрадпрыемстве «БелдарНДІ» адкарэкставалі праектна-каштарысную дакументацыю, палічылі прыблізны кошт. Летась падрадчыкі пачалі аднаўленне моста: змантніравалі бэлькі маставога збудавання, паклалі маналітныя жалезабетонныя пліты, замянілі пралёты, устанавілі дэфармацыйныя швы, агароджу і лесвіцы. Адрамантавалі аб'ект з апераджэннем запланаваных тэрмінаў амаль на паўгода.

— Гэты мост — стратэгічна важны аб'ект, бо ён з'яўляецца сувязным звяном, мае вялікае эканамічнае і сацыяльнае значэнне не толькі для раёна, — адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця новага аб'екта **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — «Гомельаблдарбуд» дастойна справіўся з пастаўленай задачай, дзякуй ім за гэта.

Даўжыня моста — амаль 170 метраў, плошча — больш за 1800 «квадратаў». Кошт новага аб'екта па каштарысе — 3,7 мільёна рублёў. **Генеральны дырэктар камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельаблдарбуд» Ігар КРАЎЧАНКА** звярнуў увагу на тое, што новы аб'ект выкананы з прымяненнем розных складаных тэхнічных рашэнняў:

— Таму асобныя словы падзякі прадпрыемству «Спецмостабуд», якое дапамагала ўзводзіць мост, праекціроўшчыкам, што выпрацавалі тэхнічныя рашэнні, а таксама рабочым, дарожнікам, майстрам, прарабам, усім, хто ўдзельнічаў у стварэнні важнага аб'екта.

Па словах **старшыні Акцябрскага райвыканкама Сяргея ДАЎГАЛЁВА,** вельмі важна, што абноўлены мост звязвае палескія раёны Гомельшчыны і Брэстчыны.

— Новы мост дазволіць развіваць новымі тэмпамі і ў новай якасці транзітны патэнцыял, а значыць, і эканоміку рэгіёна, — адзначыў ён.

Першымі па новым мосце праехалі кіроўцы спецыялізаванай тэхнікі лясной гаспадаркі, прадпрыемства па аграхімічным абслугоўванні «Акцябраграхімія», спецтэхніка МНС, машыны раённага аддзела ўнутраных спраў і раённай бальніцы. Вядома, што прапускная здольнасць моста дазволіць з лёгкасцю забяспечыць трафік па маршруце. Цяпер інтэнсіўнасць руху па гэтым кірунку за суткі — звыш 550 аўтамабіляў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ПЯСНЯР ПАЛЕССЯ — ГЕРОЙ КНІГІ

## У новае выданне пра Мележа ўключаны ўспаміны яго родных і сяброў

**Выдавецтва «Мастацкая літаратура» падрыхтавала для прыхільнікаў беларускай класікі навінкі. Да 100-годдзя Івана Мележа, якое адзначаецца сёлета, 8 лютага, перавыдалі раман «Людзі на балоце», а яшчэ выпусцілі кнігу пра народнага пісьменніка «Іван Мележ. Пясняр Палесся». Выданні прадставяць на Мінскай кніжнай выстаўцы-кірмашы, які пройдзе ў сталіцы з 18 да 21 лютага.**

— Мы павінны шмат расказваць пра класіку нашай літаратуры сённяшнім чытачам, у тым ліку і пра раман «Людзі на балоце», які для старэйшага пакалення і пісьменнікаў, і чытачоў — своеасаблівая мастацкая Біблія. Кніжны рынак перанасычаны. Не паспее выйсці новы твор пісьменніка хоць бы ў Францыі, хоць у Германіі, Расіі, ён тут жа можа з'явіцца ў кнігарнях, у тым ліку і беларускіх. І сёння вельмі цяжка паверыць, што некалі (а гэта было ў 1961 годзе) раман Івана Мележа «Людзі на балоце» стаў сенсацыяй, ён адкрыў абсалютна іншыя абсягі беларускай літаратуры, — адзначыў на сустрэчы з журналістамі **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК.** — Мележ заняў такое ж месца, якое ў сусветнай літаратуры займаюць Фолкнер, Шолахаў з яго «Ціхім Донам». І вось, калі ў 1961 годзе раман друкуюць у некалькіх нумарах часопіса «Полымя», то адбываецца нешта неверагоднае для тагачаснай беларускай літаратуры. Выходзіць чарговы нумар з раманам, і тут жа знікае з кіёскаў, раскупляецца. Тыраж «Полымя» адразу рэзка вырас. І гэта сведчыць, што ў беларускую літаратуру прыйшоў геніяльны пісьменнік, які даказаў — яна такая ж цікавая і выдатная, як любая літаратура народаў свету.

Сапраўды, раман і цяпер, праз 60 гадоў пасля першай публікацыі, не страчвае сваёй актуальнасці і мастацкай прыгажосці. Твор застаецца цікавым, як і жыццё яго аўтара, пра якое можна шмат даведацца з кнігі «Іван Мележ. Пясняр Палесся», што выдалі ў серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Укладальнікам кнігі стаў зямляк пісьменніка, **паэт Мікола МЯТЛІЦКІ.**

— Мележ ніколі не сыходзіў з далягляду беларускай літаратуры. І гэтая кніга яскрава паказвае вобраз пісьменніка, захоўвае памяць аб ім і пацвярджае, што вялікая літаратура вечна жывая. Час, калі жыў і працаваў Мележ — гэта былі вельмі палемічныя і напружаныя гады літаратурнага існавання. Я нарадзіўся ў тым жа Хойніцкім раёне, і імя Івана Паўлавіча Мележа мне было вядомае са школьных гадоў. Ён — прыклад таго, якой стваральнай можа быць літаратура. Якой яна можа быць моцнай духоўнай сілай. І як можна праўдай жыцця, увасобленай у мастацкіх вобразах, захапіць не толькі земляко ў, але і багата людзей у цэлым свеце, — кажа Мікола Мятліцкі. — Яаднёсся да ўкладання гэтай кнігі як да самага вялікага запавета самога Мележа. Давялося багата і настойліва папрацаваць. І далёка не ўсё сюды ўключана. Але сярод таго, што ёсць, — галасы калег пісьменніка і крытыкаў яго твораў, успаміны яго жонкі, дачок, сястры, аднакласніка. А раздзел «Раман — гэта народ» распавядае пра ўсе жанры, у якіх працаваў Іван Паўлавіч. Ёсць таксама і ўспаміны Івана Шамякіна «Палёт над Палессем».

Варта адзначыць, што «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» — гэта серыя, якая існуе ўжо 17 гадоў. Кнігі яе вельмі каштоўныя, таму што даюць нам, чытачам, магчымасць знаёміцца з таленавітымі, выдатнымі майстрамі мастацтва розных часоў. І даюць уяўленне не толькі пра асоб, але і пра час, у які яны жывуць і пішуць сваё радкі ў гісторыі нацыянальнай культуры.

— У серыі «ЖЗЛБ» выйшлі таксама кнігі пра Уладзіміра Караткевіча, Кузьму Чорнага, Леаніда Шчамялёва, Расціслава Янкоўскага, Якуба Коласа, Янку Купалу, Івана Шамякіна, Марыю Захарэвіч, — распавядае галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп. — І вось цяпер серыя папоўнілася кнігай «Іван Мележ. Пясняр Палесся» пра яшчэ аднаго нашага класіка. «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» будзе мець свой працяг. Наперадзе выданне новых кніг, бо гэта наша гісторыя і даніна памяці тым творчым людзям, якія жылі да нас, якія думалі пра Беларусь і сталі гонарам нашай краіны.

**Алена ДРАПКО.**

Надвор'е

# МЕСЦАМІ МОЦНЫ ПРАЦЯГЛЫ СНЕГ

**На гэтым тыдні маразы — да 20 градусаў, якія пры парывістым ветры будуць адчувацца як усе мінус 30**

**Вось ужо зіма дык зіма. Другі тыдзень лютага зладзіць нам дадатковую праверку на ўстойлівасць. Прыйдзецца актыўна папрацаваць камунальнікам, дарожнікам, супрацоўнікам МНС, медыкам і іншым службам. А ўсё таму, што на гэтым тыдні чакаюцца складаныя ўмовы надвор'я.**

Актыўныя франтальныя раздзелы ўжо ўчора выклікалі ў паўднёва-заходніх раёнах нашай краіны пагаршэнне надвор'я. А сёння днём уплыў актыўных франтальных раздзелаў распаўсюдзіцца на большую частку тэрыторыі краіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У сераду надвор'е крыху «суцішыцца». Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег, слабая завіруха. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—18 марозу, пры праясненнях — да мінус 20 градусаў. Удзень будзе 8—15 градусаў ніжэй за нуль.

У чацвер і пятніцу на дарогах і ў дварах у нас зноў будзе «снежная карусель». У чацвер у начныя гадзіны пераважна па паўднёвым захадзе, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, удзень месцамі чакаюцца моцны снег, завіруха, снежныя заносы. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—18 марозу, месцамі — мінус 19—22 градусы. Удзень будзе ад мінус 8 градусаў да 14 марозу, па паўднёвым усходзе — мінус 5—7 градусаў.

Амаль на працягу цэлых сутак у пятніцу будзе ісці снег. Уначы пераважна па паўднёвым усходзе Беларусі, удзень месцамі чакаецца моцны снег. На большай частцы тэрыторыі краіны прагназуецца завіруха, узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, на дарогах снежныя заносы. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 10—17 марозу, па паўднёвым усходзе — ад мінус 6 градусаў да 9 марозу.

І яшчэ. Сіноптыкі рэкамендуюць звяртаць увагу на тое, што вецер пры моцных парывах аказвае значны ўплыў на сілу маразоў. Так, 10 градусаў марозу пры хуткасці ветру 11—15 м/с адчуваецца як мінус 21—22 градусы. Гэта неабходна ўлічваць, асабліва калі стаяць (ісці) на вуліцы трэба досыць доўга.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Прыклад добрых спраў і прыстойных паводзін

**У Мінску да 580-годдзя з дня нараджэння вялікага паэта і мысліцеля Алішэра НАВАІ, чые імя, справы і сёння ў вялікай пашане ва Узбекістане, выйшла кніга «Улюбёны сэрцаў».**

Гэта — другая сустрэча беларускага чытача з творчай спадчынай стваральніка новых традыцый для цюркскіх літаратур. У 1993 годзе ў перакладах Васіля Жуковіча ўбачыла свет кніга «Лірыка» Алішэра Навай. Цяпер выдавецтва «Белпрынт» пры падтрымцы Пасольства Узбекістана ў Рэспубліцы Беларусь выдала ёмісты фаліянт «Улюбёны сэрцаў», дзе змешчаны пераклады Дауда Радкевіча. Вось што расказвае перастваральнік мастацкіх вобразаў і сімвалаў легендарнага творцы на беларускую мову: «Перад вамі — пераклад літаратурнага скарбу, своеасаблівай энцыклапедыі этыкі, выдатнага трактата «Улюбёны сэрцаў», напісанага паэтам амаль у канцы свайго жыццёвага шляху. Напісаны рыфмаванай прозай (садж), твор перасыпаны вершаванымі ўрыўкамі. Нібы дыяменты ў кароне, у кожнымі раздзеле змешчаны вершы ў форме кыта, маснаві, бейта і рубаі. Апошнія больш вядомыя па творчасці Умара Хаяма, але гэта такі ж папулярны від верша, як вядомыя нам санеты, трыялеты ці лімерыкі. Радкі, поўныя глыбокіх жыццёвых назіранняў, мудрых настаўленняў і карысных парад, суцяшаюць засмучаных, весяляць меланхалічных, а часам — заклікаюць задумацца нядбайных. Кожны можа знайсці на старонках гэтай кнігі знаёмых сучаснікаў і асоб мінулага. Аўтар па-добраму ўшчувае тых, хто забыўся пра прыстойнасць, шчодра дзеліцца мудрасцю і перасцерагае ад памылак».

З вялікім уступным артыкулам да выдання выступае рэктар Ташкенцкага дзяржаўнага ўніверсітэта ўзбекскай мовы і літаратуры імя Алішэра Наваі доктар філалагічных навук Шухрат Сіражыддзінаў. Вучоны нагадвае, што Алішэр Наваі ўсё жыццё апяваў дружбу народаў, заклікаў да салідарнасці і талерантнасці, асветы і добрых спраў, узвялічваў агульначалавечыя каштоўнасці.

— Мы ўдзячныя беларусам за ўвагу да нашага асветніка, — каментуе факт выдання кнігі Алішэра Наваі ў Мінску **дарадца па палітычных пытаннях Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Даніяр АБІДАЎ.** — У Мінску з'явіўся помнік нашаму геніяльнаму суайчынніку, выходзяць яго кнігі. Спадзяюся і на даследчыцкую ўвагу да здзейсненага легендарным творцам.

А толькі што выдадзеная беларуская кніга Алішэра Наваі трапіць у вядучыя бібліятэкі Беларусі, у ВНУ і розныя асветніцкія ўстановы.

**Сяргей ШЫЧКО.**




# ПРАЗ ПРЫЗМУ

*У наступным пяцігоддзі задачы дэмаграфічнай палітыкі застануцца нязменнымі: стабілізаваць колькасць насельніцтва і стварыць умовы для яе наступнага росту.*



**Наталля КАСЦЮК, кіраўнік справамі Белавушскага сельскага Савета Столінскага раёна, маці чацвярых дзяцей:**

— Спачатку крыху пра нашу вёску Белавушу: у населеным пункце жыве 3040 чалавек, у нас ёсць сярэдняя школа, дзіцячы садок, Дом культуры, дзевяць магазінаў, пошта, банк — словам, у наяўнасці ўся інфраструктура плюс добрыя дарогі. Ёсць адна асаблівасць: мы жывём у чарнобыльскай зоне. Белавуша трапіла ў «тэрыторыю для адсялення з узроўнем забруджвання ад 5 да 15 кюры». Таму мы карыстаемся пэўнымі льготамі: напрыклад, дапамога на дзіця ва ўзросце да трох гадоў складае 150 працэнтаў.

І пра сябе: маю трох сыноў 12, 10, 8 гадоў і 5-гадовую дачку. Жывём мы ў сваім прасторным і ўтульным доме, які купілі ў крэдыт пасля нараджэння трэцяга дзіцяці. Пасля нараджэння дачушкі, яна стала ў нас чацвёртым дзіцем па ліку, крэдыт быў поўнасцю пагашаны дзяржавай. Мы ўзялі яшчэ адзін крэдыт на рамонт і рэканструкцыю, таксама льготны, пад тры працэнты, які плацім самастойна і без асаблівых праблем. Такім чынам сям'я мае цагляны дом з выгодамі плошчай 85 квадратных метраў. Для жыцця, паспяховай работы, вучобы ўсё ёсць.

Мы, як і абсалютная большасць столінцаў, прывыклі працаваць. Як паспяваю і на рабоце, і дома? Дык мы з маленства прывучаныя да работы сваімі бацькамі, гэтак жа выхоўваем сваіх дзяцей. Мне старэйшыя дапамагаюць і па доме, і ў агародзе. Агарод у нас вялікі, вырошчваем капусту, памідоры не толькі для сябе, але і на продаж. Так робяць усе ў нашай вёсцы.

Наша малодшанькая нарадзілася ў 2015 годзе, на яе мы ўжо аформілі сямейны капітал. Дзеці ходзяць у садок і ў школу. Для іх паспяховай вучобы, для развіцця ўсё ёсць на месцы. Хоць некаторыя бацькі-аднавяскоўцы возяць дзяцей у Столін за сем кіламетраў. Гэта найбольш тыя з іх, хто працуе ў райцэнтры, ім так зручна: едзеш на работу, адвёз дзіця, потым забраў. Лічу, што наша школа нічым не горшая за гарадскую.

Летась у Белавушы нарадзілася 56 дзяцей, а ў 2019-м — 84 дзіцяці. У нас нараджальнасць перавышае смяротнасць, так што паказчыкі па дэмаграфічнай сітуацыі станоўчыя. Хочацца, каб такімі яны былі і ва ўсёй краіне.

На мой погляд, вельмі правільная палітыка па падтрымцы шматдзетных сем'яў у плане крэдытавання будаўніцтва жылля, наліччэння сямейнага капіталу. А вось наконт памяншэння працягласці дэкрэтнага водпуску (цяпер на гэту тэму вядзецца абмеркаванне ў прэсе) трэба добра падумаць. Лічу, што гэта наша дасягненне, ад якога не варта адмаўляцца. Далёка не ўсе дзеці ў два гады маюць навыкі, неабходныя для знаходжання ў дашкольнай установе. Ну не заўсёды дзіця можна аддаць у яслі ў два гады, гэта можа стаць праблемай для сям'і. І трэба паглядзець, ці шмат выйграе дзяржава ў такім выпадку. У нас ёсць, напрыклад, сем'і, дзе маці зусім не выходзяць на работу, бо гадуюць 9, 10, 12 дзяцей. Нагатаваць, прыбраць, памыць на такую сям'ю, правесці ў школу і сустрэць — вось вам і поўная занятасць не на 8 гадзін нават, а нашмат больш. Трэба пралічваць і магчымыя «бальнічныя», і маральныя страты ў выпадку скарачэння працягласці дэкрэтнага водпуску. Таму не варта прымаць рашэнне, не ўзважыўшы ўсе «за» і «супраць». Гэта адно.

А другое, аб чым я б хацела сказаць на тэму дэмаграфіі, — гэта вострая неабходнасць павелічэння колькасці рабочых месцаў у глыбінцы. Даволі часта сустракаюся, размаўляю з аднакласнікамі, якія з'ехалі ў іншыя гарады. Фактычна ўсе называюць прычынай ад'езду адсутнасць работы. Вось і мой муж, каб дастойна ўтрымліваць сям'ю, працуе вахтавым метадам у Расіі, і большую частку года я адна цягну на сабе ўсе сямейныя клопаты.

Мы пастаянна чытаем, якія грандыёзныя праекты ажыццяўляе бізнес у сталіцы і яе ваколіцах, побач з іншымі вялікімі гарадамі. Думаю, што прыспеў час рухаць бізнес у глыбінку, каб людзі атрымлівалі добрыя рабочыя месцы. Бо менталітэт вясковага чалавека адрозніваецца ад менталітэту гарадскога. Гэта ў нас на падсвядомым узроўні закладзена патрэба ў вялікай сям'і. У сталіцы дзяцей мала нараджаюць. А ў нас, на Століншчыне, цяпер жывуць 2230 шматдзетных сем'яў, 731 жанчына ўзнагароджана ордэнам Маці. Нам толькі трэба развіваць вытворчасць, якая забяспечыць занятасць. Тады не давядзецца для шматдзетных вяскоўцаў будаваць кватэры ў горадзе, як гэта робіцца сёння. Летась дзевяць шматдзетных сем'яў з нашага сельсавета атрымалі кватэры ў Століне.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

*Будзе прадоўжана работа па стварэнні стабільных, камфортных, канкурэнтных і прагназуемых умоў для інвеставання і вядзення бізнесу. Акцэнт будзе зроблены на ўмацненне даверу дзелавой супольнасці да дзейнасці дзяржаўных інстытутаў, аптымізацыю рэгулятарнага асяроддзя.*



**Дзмітрый КРЫЛОЎ, кіраўнік сялянска-фермерскай гаспадаркі «ДАК» Дзяржынскага раёна:**

— Мне імпануе, што асноўныя палажэнні праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады прадугледжваюць спрыяльнае асяроддзе для вядзення бізнесу, разняволенне дзелавой ініцыятывы, укараненне сучасных тэхналогій ва ўсе галіны народнай гаспадаркі.

У прыватнасці, пяць гадоў таму мы распрацавалі бізнес-план па развіцці козагадоўлі. А менавіта будаўніцтва фермы на 1600 галоў, а таксама адкрыццё лабараторыі па эмбрыянальным размнажэнні дробнай рагатай жывёлы. ЭКА-тэхналогіі значна павялічаць выхад маладняку, паколькі ён будзе з'яўляцца «з прабіркі». Ад адной высокапрадукцыйнай казы мяркуецца атрымаць да 25 малых у год.

Не ведаю, як іншыя фермеры, але я не крыўдзе. Калі мы звярнуліся да дзяржавы за падтрымкай, нам пайшлі насустрач. Праект забяспечваецца датацыямі інавацыйнага фонду Мінскай вобласці і Банка развіцця. Гаспадарка таксама ўкладвае асабістыя сродкі ў справу.

Адпаведна, той комплекс, які будуем, стане навукова-практычным цэнтрам, увасобіць у сабе ўсе найлепшыя, перадавыя дасягненні ў галіне козагадоўлі. Акрамя племяннай работы, збору генетычнага матэрыялу, эмбрыянальнага размнажэння, павелічэння пагалоўя, тут будуць прадаваць жывёлу, аказваць паслугі па перасадцы эмбрыёнаў.

Прадугледжаны таксама новыя тэхналогіі ўтрымання, даення, кармлення. Мяркуецца стварыць экалагічную станцыю, дзе зерне будзе прарошчвацца гідрапонным метадам. Дзякуючы гэтаму жывёла будзе мець круглы год зялёны корм.

Вядома, што новыя падыходы ў справе козагадоўлі патрабуюць высокай кваліфікацыі работнікаў. У нас ёсць два ветэрынарныя ўрачы. Адкрыта вакансія ўрача па аперацыйнай рабоце, а менавіта па перасадцы эмбрыёнаў, шукаем зацікаўленага чалавека. Вучыць яго будзем за мяжой. Гэтымі тэхналогіямі нават у Еўропе мала хто валодае. Згадзіўся да нас прыехаць і доктар навук са Злучаных Штатаў Амерыкі — навучаць персанал.

На мой погляд, нядрэнна, каб у фермераў было сваё прадстаўніцтва, якое ўмее іх навучаць і канцэнтраваць веды, уменні, прадставіць іх інтарэсы ў вялікіх гандлёвых сетках. Там неабходны пастаянныя і рэгулярныя вялікі аб'ём, а ў фермераў маленькія партыі прадукцыі...

*Пільная ўвага будзе аддадзена павышэнню ўзроўню кадравай забяспечанасці, уключаючы пытанні падрыхтоўкі кадраў сельскагаспадарчага профілю і іх замацавання на вёсцы.*



**Аляксандр ЛАПАЦЕНТАЎ, старшыня СВК «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна:**

— Я ўсё сваё жыццё пражыў у вёсцы і ніколі не памяняю яе на горад. Больш за 90 % членаў нашага кааператыва таксама сяляне, прычым не ў адным пакаленні. Дык чаму ў нашай вёсцы Вішоў яны застаюцца, а ў іншых — не? Растлумачыць складана, бо ў кожнага сваё разуменне. Для мяне, як для селяніна, пытанне вельмі балючае. Калі пра гэта пачынаю казаць, сэрца шчыміць.

Я сам са шматдзетнай сям'і, восьмае дзіця з дзевяці. Мае бацькі — жывёлаводы, працаўнікі ад зямлі — цалкам прысвяцілі сваё жыццё гэтай справе. І дзецям сваім далі добрую адукацыю, некаторыя з нас маюць ажно па 2-3 вышэйшыя адукацыі. Я вось — калгаснік. Сорак гадоў таму, калі партыя і ўрад паставілі мяне на гэты пост, мне было ўсяго 25 гадоў — зусім яшчэ «зялёны» па сельскіх мерках кіраўнік. Вядома, былі сумненні, але мне вельмі хацелася сцерці розніцу паміж горадам і вёскай не на паперы, а на самай справе.

Не скажу, што мы зламілі птушку шчасця, але пэўных вынікаў дасягнулі. Апошнія дзесяць, а можа, і больш гадоў жывём у калгасе па Канстытуцыі — рэгулярна пакідаем святочныя і выхадныя дні. І гэта таксама дасягненне, бо не ва ўсіх гаспадарках так жывуць.

Некаторыя патанулі з галавой у гноі і гумавых ботах — прасвету не бачаць. Мы ж ад гэтага адышлі. На сённяшні дзень па максімуме стварылі ўмовы і для жыцця, і для работы людзей. У нас ёсць добрыя рабочыя месцы, зручная тэхніка, сучасныя тэхналогіі, рэжым дня.

Калі я прыйшоў у калгас, у мяне была мара дажыць да таго часу, калі даярка летам прыйдзе на работу не ў гумавых ботах, а ў басаножках. І сёння нашы сялянскія дзяўчаты выглядаюць не горш за гарадскіх. Таму што мы стварылі ўмовы.

У маім дзяцінстве бацькі пагражалі: будзеш дрэнна вучыцца, пойдзеш у калгас працаваць трактарыстам. Тады гэта здавалася чымсьці накшталт турмы. А сёння спытайцеся ў нашага дэлегата, механізатара Мікалая Дарэчкіна, пакаранне гэта для яго або цікавая, з дастойнай зарплатай работа. У яго сёння ў ўзбраенні сучасны камбайн, машына настолькі перадавая і разумная, што чалавек без мазгоў або п'яны проста не зможа на ёй працаваць. І ў нас такой тэхнікі працэнтаў 80.

Для нас такога выразу, што, калі будзеш дрэнна вучыцца, пойдзеш у калгас, больш няма. Мы яшчэ не кожнага да сябе возьмем.

Сваімі сіламі і за свой кошт пабудавалі Дом культуры, музей, амфітэатр, алею Славы, узвялі па сваім праекце храм і даглядаем яго. Нават зарплату свяшчэнніку плацім. Можам сабе дазволіць. Пенсіянерам, ды і ўсім нам вельмі важнае гэта месца для душы. Дапамагаем школе, вучні праходзяць у нас на канікулах практыку і атрымліваюць за гэта грошы. У нас сёння няма пытання, як затрымаць моладзь. Мы ім стварылі ўсе ўмовы.

Цудоўна, калі ёсць праграма, але ўсё трэба рабіць у комплексе. Сёння ў Вішове кватэры не пустуюць, але ёсць гаспадаркі, дзе ад тых дамоў адны фундаменты засталіся.

Пабудаваць жыллё мала, трэба яшчэ стварыць рабочыя месцы, умовы для адпачынку, тэхнікай чалавека забяспечыць.

Хіба гэта не праграмныя пытанні? Пад праграму патрэбны людзі, прычым спецыялісты, якія жадаюць працаваць на вёсцы. З будучымі кадрамі трэба вельмі сур'ёзна працаваць. Сёння на ўсіх узроўнях не саромеюся казаць: вярніце работу з кадрамі партыйных часоў. І нічога не трэба больш прыдумваць.

Трэба рыхтаваць кадры са школьнай парты. Спецыялісты павінны быць свае, карэнныя, іх не трэба прывозіць аднекуль. Калі малады чалавек пойдзе вучыцца на заатэхніка, мы будзем ведаць, з якой ён сям'і. І не трэба будзе гадаць, застанецца ён пасля адпрацоўкі або не. У нашым раёне ёсць добрыя прыклады. Той жа Аляксандр Вяселеў, дырэктар ААТ «Райагратэхснаб».

Любоў да гэтай асаблівай работы павінна быць у генах. Гэта вельмі асаблівая работа, гэта — дынастыі. Інакш мы будзем ствараць умовы для селяніна, а прыедзе дачнік. Часам ад горада таксама хочацца адпачыць. Але працаваць ён сюды не прыйдзе. Сялянская праца патрабуе ахвяравання. І павінен быць стымул. А яшчэ трэба даверыць. Сёння чалавек паўгода папрацаваў, камусьці нешта не спадабалася, і яго адхілілі, паставілі новага. Калі пачынаецца такая мітусня, нічога талковага не атрымаецца. Гаспадарка разваліцца, а людзі разбягуцца.

Прэзідэнт зрабіў вельмі важны крок — затармазіў разлад вёскі. Цяпер трэба змяніць сітуацыю. І да праграмы павінна быць падрабязная інструкцыя, як тое, што ў ёй прапісана, рэалізаваць. А то чытаеш, напрыклад, «павялічыць зарплату» і думаеш: а за кошт чаго? Павінен быць выразны план. Цаліну ў савецкі час ехалі асвойваць таму, што была складзена праграма і пад яе дадзены сродкі. Спачатку трэба нешта даць, каб потым пытаць за гэта. Толькі так можна пачаць ствараць будучага селяніна. Таго, які быў, мы ўжо страцілі.

# РЭАЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

*«Будзе створана адзіная тэлекамунікацыйная інфраструктура аховы здароўя, паэтапна асвоены новыя метады персаніфікаванай медыцыны для павышэння рэзультатыўнасці лячэння з прымяненнем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.*



**Аліна ШЧУПАКОВА, прарэктар па вучэбнай і лячэбнай рабоце Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар:**

— Павышэнне якасці жыцця насельніцтва непарыўна звязана з развіццём аховы здароўя краіны. Адзін з найважнейшых кірункаў — удасканаленне даступнасці медыцынскай дапамогі з выкарыстаннем сучасных камунікацыйных тэхналогій.

З красавіка 2020 года ў нашым універсітэце пачаў функцыянаваць «Цэнтр экстраннага тэлемедыцынскага кансультавання». Гэта было асабліва актуальна і своечасова ў сувязі з істотным уздымам захваральнасці на вострыя рэспіратарныя інфекцыі, у тым ліку COVID-19. Стварэнне такога цэнтра дазволіла павысіць даступнасць і аператыўнасць аказання высакаякаснай кансультацыйнай дапамогі пацыентам. Так від кансультацыйнай дапамогі дазваляе скарэктаваць дыягнастычны і лячэбны працэс за кароткі час і аказаць дапамогу вялікай колькасці пацыентаў, незалежна ад аддаленасці ўстановы аховы здароўя, куды яны звярнуліся па дапамогу.

На працягу мінулага года для выканання тэлемедыцынскіх кансультацый у «Рэспубліканскім цэнтры арганізацыі медыцынскага рэагавання» былі зарэгістраваны 73 выкладчыкі нашага ўніверсітэта. Яны маюць вучоную ступень кандыдата альбо доктара медыцынскіх навук, а таксама першую або вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Летась яны правялі больш за сто сеансаў тэлемедыцынскага кансультавання. Найбольш актыўна дадзеным відам кансультацыйнай дапамогі скарысталіся раённыя бальніцы ў Браславе, Мёрах, Бешанковічах і іншых населеных пунктах.

Аднак не толькі ўкараненне сучасных камунікацыйных тэхналогій спрыяе павышэнню якасці медыцынскай дапамогі. Неад'емным этапам развіцця з'яўляецца стварэнне, акрамя цэнтраў высокатэхналагічнай медыцыны ў рэгіёнах, яшчэ і ўніверсітэцкіх клінік.

У нас распрацоўваецца канцэпцыя стварэння Віцебскай універсітэцкай клінікі — шматпрофільнага медыцынскага цэнтра «замкнёнага цыкла» — для аказання сучаснай высокатэхналагічнай спецыялізаванай медыцынскай дапамогі на рэгіянальным узроўні.

Яго стварэнне дазволіць знізіць нагрузку на рэспубліканскія і абласныя спецыялізаваныя цэнтры за кошт зніжэння патокаў пацыентаў, паменшыць тэрміны атрымання спецыялізаванай дапамогі пацыентам, якія маюць патрэбу ў высокаспецыялізаванай меддапамозе пры розных захворваннях. Гэта неабходна для работы кафедраў універсітэта, забеспячэння практыкаарыентаванай падрыхтоўкі студэнтаў, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, праходжання інтэрнатуры, клінічнай ардынатуры, магістратуры, аспірантуры як беларускімі, так і замежнымі грамадзянамі, а таксама правядзення навукова-даследчай работы, распрацоўкі і ўкаранення новых медыцынскіх тэхналогій. Стварэнне ўніверсітэцкай клінікі неабходна для забеспячэння павышэння якасці і эфектыўнасці медыцынскай дапамогі насельніцтву вобласці і краіны ў цэлым. Гэта паспрые актыўнаму стварэнню перадавых медыцынскіх тэхналогій і будзе ўкладам універсітэта ў эканоміку і інавацыйнае развіццё краіны з мэтай далейшага ўдасканалення практыкаарыентаванай падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў, забяспечыць рост экспарту медыцынскіх і адукацыйных паслуг у ВДМУ, а таксама базу для стварэння і ўкаранення новых медыцынскіх тэхналогій, іх камерцыялізацыі.

*«Стратэгія развіцця прамысловай вытворчасці прадугледжвае яе трансфармацыю ў канкурэнтаздольны комплекс, які аператыўна рэагуе на сусветную кан'юнктуру і патрэбы ўнутранага рынку. Мэтавы арыенцір — павелічэнне прадукцыйнасці працы ў прамысловасці ў 1,3 раза.*



**Андрэй БАБОВІЧ, дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага сэрвіснага прадпрыемства «Агенцтва развіцця і садзейнічання інвестыцыям», кандыдат эканамічных навук, дацэнт (Гомель):**

— Сёння нашы прадпрыемствы сутыкнуліся з неабходнасцю дыверсіфікацыі вытворчасці. Усім зразумела, што ў сучасных умовах складана займацца выключна адным відам дзейнасці. Гэта можна ўбачыць на прыкладзе буйных айчынных вытворчых прадпрыемстваў, спектр прадукцыі якіх пашырыўся на дзясяткі гадоў пазней, чым на аналагічных прадпрыемствах у свеце. Але рынкі былі ўжо страчаны. Пры гэтым на канкурэнтаздольнасць вытворчага прадукту таксама ўплывае нязначная ўдзельная вага ў сабекошце вырабаў інавацыйнага складніка. Стварэнне інавацыйна-прамысловых кластараў — гэта адказ на выклікі сучаснага рынку. Асноўная мэта падобных канкурэнтаздольных эканамічных аб'яднанняў — выпуск новай высокатэхналагічнай, навукаёмістай прадукцыі.

У сваю чаргу неабходныя інавацыйныя распрацоўкі могуць акумулявацца на базе такіх бізнес-лакацый, як тэхнапаркі. Гэта сувязнае звяно паміж прадпрыемствамі рэальнага сектара эканомікі, навукай, адукацыяй. І не менш важна, што тэхнапарк — гэта матыватар для ўзаемадзеяння з самастойнымі вынаходнікамі, інжынерамі-пачаткоўцамі, якія імкнуцца рэалізаваць свае тэхналагічныя стартапы. Тэхнапарк можа выступаць цэнтрам калектыўнага карыстання сучасным абсталяваннем для стварэння прататыпаў.

Як прыклад, тэхнапарк «Карал». Сёння гэта першая ў краіне практыка стварэння «экасістэмы» для развіцця прамысловых і інавацыйных складнікаў эканомікі пры свабоднай эканамічнай зоне. Тэхнапарк «Карал» заснаваны на базе рэзідэнта СЭЗ «Гомель-Ратон» рэспубліканскага ўнітарнага сэрвіснага прадпрыемства «Агенцтва развіцця і садзейнічання інвестыцыям». Прынамсі, рэзідэнтамі СЭЗ таксама з'яўляюцца 70 вытворчых прадпрыемстваў Гомельшчыны самай рознай накіраванасці.

Сёння прайсці практыку ці працаўладкавацца на паспяховае вытворчае прадпрыемства студэнтам вельмі складана. Таксама цяжка наладзіць прадукцыйнае ўзаемадзеянне паміж вытворцамі і навукоўцамі, таму што паміж імі няма прамых кантактаў. Тэхнапарк «Карал» сёння выходзіць з прапановай аб стварэнні адмысловых лабараторый. Вытворчых лакацый, дзе б маглі ўзаемадзейнічаць і працаваць над агульнымі праектамі як рэзідэнты свабоднай эканамічнай зоны, так і выкладчыкі ВНУ і студэнты, прадстаўнікі прафтэхадукацыі і навучэнцы каледжаў, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі са сваімі стартапамі.

Падобны досвед дапаможа прадухіліць і такую негатыўную тэндэнцыю сярод моладзі, як імкненне рэалізаваць свае прафесіянальныя амбіцыі і развіць кампетэнцыі на замежных прадпрыемствах. Сёння здараецца так, што нашы таленавітыя маладыя людзі, якія вучацца на тэхнічных спецыяльнасцях, проста не цікавяцца перадавымі прадпрыемствамі свайго рэгіёна. А між тым, толькі на тэрыторыі Гомельшчыны сёння працуе шэраг кампаній, тэхнічнае аснашчэнне і вытворчы патэнцыял якіх не саступае канкурэнтам за мяжой.

Сёння тэхнапарк «Карал» зрабіў свой уклад у перспектыўнае развіццё інавацыйна-прамысловай прасторы рэгіёна і краіны ў цэлым. Мы заключылі дагаворы аб супрацоўніцтве з ВНУ. Толькі ў гэтым месяцы, напрыклад, да нас упершыню прыходзяць на вытворчую практыку студэнты Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога. Гэта будзе абсалютна новая спецыяльнасць — вытворчасць вырабаў на аснове трохвымерных тэхналогій. Падобны вопыт падрыхтоўкі на базе тэхнапарка — таксама новая практыка для краіны. Задачай для нашых «навабранцаў» будзе асвоіць на прыктыцы работу з 3D-абсталяваннем тэхнапарка і зрабіць прататыпы сваіх вырабаў. Таксама сёння ідзе актыўная работа са студэнтамі і навукоўцамі ГДУ імя Ф. Скарыны і БелДУТа. Вельмі перспектыўным сёння з'яўляецца выкарыстанне вытворчага рэсурсу для рэалізацыі распрацовак навукоўцаў Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

*«Працягнецца работа па стварэнні нацыянальных культурных брэндаў, у тым ліку арганізацыя фестываляў народнай творчасці, развіццё народных промыслаў і рамёстваў... Удасканаленне музейнай дзейнасці запатрабуе ўкаранення асобных распрацовак у сферы інфармацыйных тэхналогій.*



**Алёна КЛІМОВІЧ, начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама:**

— Зараз рыхтуецца новая праграма «Культура Беларусі» на 2021—2025 гады. На Гродзеншчыне ў гэтай галіне працуе больш за 630 устаноў і 7 тысяч чалавек. Падмуркам для ажыццяўлення праграмы стане і наша спадчына, як матэрыяльная, так і нематэрыяльная. Гродзеншчына ў гэтым плане вельмі багаты рэгіён, тут захавалася больш за 700 гісторыка-культурных аб'ектаў. Гэта і замкі, і сядзібы, і культавыя збудаванні, што ўключаюцца ў агульнатурыстычныя маршруты.

Якія новыя кірункі дзейнасці мы бачым? Па-першае, гэта музейны патэнцыял. Толькі 7 % музейных фондаў выстаўляецца ў экспазіцыях і выстаўках. Гэта мала. Музеі могуць стаць месцам прыцягнення як мясцовых жыхароў, так і турыстаў. Прыклад — музей-сядзіба М. К. Агінскага ў Смаргонскім раёне. Тут за мінулы год было прынята больш за 24 тысячы наведвальнікаў. Для гэтага выкарыстоўваецца не толькі сам музей, але і асяроддзе парку. Мала ў якіх музеях ёсць карэта з конямі, а тут такая атракцыя дзейнічае. Турыстаў катаюць у ёй па маляўнічым парку з альтанкамі, падчас паездкі выкарыстоўваюць тэатральныя элементы. Цікавы музей працуе ў Лідскім замку. Спалучэнне гісторыі, музейнай экспазіцыі, анімацыі, адаптаванасці да наведвальнікаў — гэта тое, што цяпер добра працуе, і шлях, які трэба надалей удасканальваць. У такім сэнсе значным аб'ектам стане адноўлены Стары замак, які ўжо сёлета прыме наведвальнікаў. Будзе адкрыта цікавая музейная экспазіцыя. Завяршаюцца работы ў Гальшанскім замку, нядаўна там адкрылі візіт-цэнтр з пляцоўкай для аўтобусаў.

Мы вырашылі пайсці далей і далучыць да экскурсій яшчэ і забаўляльную анімацыйную праграму з народнымі калектывамі, танцамі, абрадамі. І гэта працуе. У тым жа музеі Міцкевіча ў Навагрудку асвоілі новы кірунак і ўдала спалучаюць музейныя экскурсіі з анімацыяй. Лічу, што гэта вельмі перспектыўны кірунак, які будзем развіваць. Рэаліі сённяшняга часу дыктуюць новыя падыходы. І супольная работа клубаў, музеяў, гістарычных аб'ектаў якраз і ёсць такі шлях. Цяпер рыхтуецца да адкрыцця шматфункцыянальны цэнтр у Астраўцы. Жыхары любога ўзросту змогуць знайсці тут цікавы занятак. Гэта і зала для прагляду кінафільмаў, і музейная экспазіцыя, акрамя таго сюды пераязджаюць бібліятэка, дзіцячая школа мастацтва, клубная ўстанова і многае іншае.

Такі падыход пераймаюць іншыя ўстановы культуры. Адзіны ў Беларусі дзяржаўны музей рэлігіі ў канцы мінулага года запусціў праект «Сентыментальны шпацыр па яўрэйскай Гародні», які стаў даволі папулярным. Ахвотныя могуць запісацца на экскурсію па аб'ектах горада, пасля якой гасцей чакае дэгустацыя яўрэйскай кухні ў адным з кафэ горада. Гэта вельмі ўдалае спалучэнне работы дзяржаўнай установы і прыватнага аб'екта.

Прыярытэтным кірункам стане арганізацыя вольнага часу сельскіх жыхароў. Нашы вёскі маюць багатыя традыцыі, адметныя рысы, якія становяцца брэндамі многіх свят. Як, напрыклад, «Свята кветак у Жалудку» ў Шчучынскім раёне. На раённым узроўні гэта і «Іўеўскі памідор», і «Гальшанскі замак», «Смаргонскія абаранкі», «Паланэз» у Слоніме, «Свята на Аўгустоўскім канале» і іншыя.

Актыўна працуем у віртуальнай прасторы. У пачатку года аб'явілі такі чэлендж — «Культгулyня». Жыхары разам з работнікамі культуры прадстаўляюць у інтэрнэт-прасторы зімовыя забавы Гродзеншчыны. У віртуальным рэжыме распачалі праекты «Творым дома», «Таленты дома», «Святы на канапе», «Культура з дастаўкай на дом», «Культура ў тварах» і іншыя. Віртуальны наведвальнік можа выйсці на сайт установы і паглядзець майстар-клас, наведаць музей, убачыць тэатральныя, канцэртныя пастаноўкі. Ад гэтага кірунку мы не адмовімся, а наадварот, будзем развіваць, у тым ліку і ў бібліятэчнай справе. Бо да 40 % нашых наведвальнікаў — віртуальныя. Ідзе алічбоўка бібліятэчнага фонду, ствараецца зводны рэгіянальны каталог, бібліятэкі паступова далучаюцца да яго. Электронная база даступная для ўсіх карыстальнікаў, якія зарэгістраваны на сайце бібліятэкі. Гэта таксама такі пасыл, які скіроўвае на рэальнае наведванне той жа культурнай установы.

Мы вельмі спадзяёмся, што сёлета, у Год народнага адзінства, нам удасца правесці Фестываль нацыянальных культур, які ўжо стаў брэндам не толькі Гродна, але і ўсёй Беларусі.

**Падрыхтавалі Нэлі ЗІГУЛЯ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.**




# ПАВЫШАЦЬ ПРЭСТЫЖ СЕЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ

**Дырэктар ААТ «Мурава» Пружанскага раёна Пётр БІЛЕЦКІ:**


Фота sb.by

— Стары добры лозунг «Кадры вырашаюць усё» як нідзе актуальны ў сельскай мясцовасці. На вёсцы па-ранейшаму не хапае кваліфікаваных кадраў. На жаль, многія маладыя спецыялісты пасля адпрацоўкі стараюцца ўладкавацца ў горадзе. Але, каб моладзь захацела заставацца ў вёсцы, важна захаваць пэўныя льготы, у першую чаргу даступныя крэдыты на будаўніцтва жылля. Для многіх сем'яў гэта вырашальны фактар, каб назаўсёды застацца ў сельскай мясцовасці.

Кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў ведаюць, што апошнім часам стала нашмат больш складана весці будаўніцтва жылля, бо льготны крэдыт не кампенсуе кошт будаўніцтва, і срокі даводзіцца адцягваць з абаротных актываў, што няпроста нават для эканамічна моцнай гаспадаркі. Можна спытаць у кіраўніка любой гаспадаркі, якая крыху мацнейшая за «серадняка», колькі ён будуе. І ён скажа, што раней за кошт крэдытаў у год будавалі па пяць-шэсць дамоў. Цяпер будуюць адзінкі.

У сваёй гаспадарцы мы знайшлі выйсце ў пакупцы старых дамоў. Купляем вясковыя хаты, праводзім капітальны рамонт і даём сям'і спецыяліста добраўпарадкаванае жыллё з усімі камунальнымі выгодамі. Такім чынам, у год прыводзім у парадак па чатыры дамы. Кожны з іх абыходзіцца прадпрыемству прыкладна ў 30 тысяч рублёў, а не ў 150 тысяч, як таго патрабуе новае будаўніцтва. Але ва ўладкаваных населеных пунктах, аграгарадках рынак такога жылля не надта вялікі. Значыць, у будучым давядзецца кардынальна вырашаць жыллёвае пытанне.

Нашы людзі за апошні час прывыклі да высокага ўзроўню жыцця і хочуць зберагчы гэтыя дасягненні: магчымасць спакойна працаваць, атрымліваць добры заробак, вучыць дзяцей, падтрымліваць дабрабыт сям'і.

Якая б тэхніка ні прыходзіла на дапамогу сельскаму працаўніку, а праца на зямлі застаецца цяжкай. Таму вясковы чалавек павінен быць упэўнены ў сваім заўтрашнім дні, мець магчымасці для паўнавартаснага адпачынку. Значыць, належыць развіваць інфраструктуру вёскі, аддаваць увагу сельскай адукацыі і медыцыне, не забываць пра бытавое абслугоўванне.

І яшчэ адно пытанне мы актыўна абмяркоўваем з калегамі па раённай арганізацыі аграпрамысловага саюза, якую я ўзначальваю. Яно таксама датычыцца замацавання кадраў. Гаворка ідзе пра будаўніцтва жылля для вясковых шматдзетных сем'яў у горадзе. Лічу такую палітыку абсалютна няправільнай. Тым сем'ям, якія стаяць на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў у сельскай мясцовасці, трэба будаваць кватэры і дамы ў вёсцы, а не сяліць іх у сацыяльных дамы ў райцэнтры. Для гэтага трэба толькі пераразмеркаваць патокі фінансавання. А так атрымліваецца, што мы вывозім у горад патэнцыяльную рабочую сілу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «Якасць медыцынскіх паслуг і жыллёвае пытанне»



**Гэтыя дзве рэчы непасрэдна звязаны, лічыць дэлегат VI Усебеларускага народнага сходу ад Навагрудскага раёна — медыцынская сястра хірургічнага аддзялення Навагрудскай раённай цэнтральнай бальніцы Алена ГРЫНЬ.**

Алена Іванаўна працуе ў Навагрудскай ЦРБ з моманту размеркавання пасля заканчэння Гродзенскага медыцынскага вучылішча — ужо 21 год.

— Спачатку было складана, — прызнаецца дэлегат. — Хірургічнае аддзяленне — адно з самых цяжкіх. Але я асэнсавана выбрала гэты шлях, мне падабаецца такая работа: здарава, калі ты можаш дапамагчы людзям, аблегчыць іх боль, паскорыць выздараўленне. Натхняе работа побач з таленавітымі ўрачамі. Менавіта калектыў — галоўная апора ў няпростай рабоце. Цяпер людзі, з якімі я працую плячо ў плячо, — мая другая сям'я.

Прадстаўляць калектыў нашай бальніцы і ўсю медыцынскую сферу Навагрудчыны на VI Усебеларускім народным сходзе для мяне гонар і вялікая адказнасць. Чакаю пачуць там пра развіццё менавіта раённага ўзроўню аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву — гэта вельмі важнае звяно, ад яго якасці залежыць развіццё рэгіёнаў, здароўе жыхароў малых гарадоў і вёсак.

Кіраўнік нашай дзяржавы ўжо казаў пра тое, што ў будучай пяцігодцы будуць мадэрнізаваны і аснашчаны сучаснай тэхнікай раённыя бальніцы. Дарэчы, у сярэдзіне студзеня нам прывезлі камп'ютарны тамограф, які значна палепшыць дакладнасць дыягностыкі пацыентаў.

Яшчэ адно важнае пытанне, непасрэдна звязанае з якасцю медыцынскага абслугоўвання, — умовы для спецыялістаў. Апошнім часам нашы заробкі значна ўзраслі, калі так застанецца, гэта дазволіць медыцынскім работнікам самім пачаць будаўніцтва свайго жылля. Цяпер трэба, каб такое жыллё будавалася ў райцэнтрах у дастатковай колькасці.

Мне цікава будзе пачуць меркаванні ўдзельнікаў сходу, іх ідэі, якія можна будзе ажыццявіць. Спадзяюся, што вынікам стануць рашэнні, што сапраўды аб'ядноўваюць грамадства і падштурхнуць яго развіццё.

**Паліна ДЗІСКО.**

# Трэба ведаць гісторыю краіны і папулярызаваць мову

**Дэпутат Крывошынскага сельскага Савета Ляхавіцкага раёна Надзея ПАТАПЧЫК.**



Яна неаднаразова ўзнагароджвалася падзякамі за шматгадовую добрасумленную працу. Па адукацыі Надзея Пятроўна — настаўнік біялогіі, але ў пачатку сваёй кар'еры працавала загадчыцай дзіцячага садка, потым дваццаць гадоў была дырэктарам дзіцячага аздараўленчага лагера «Чайка» ў Ляхавіцкім раёне. Пасля таго як выйшла на пенсію, яе запрасілі ўзначаліць ферму ЗАТ «Белпрампрыбор». А цяпер вось выбралі дэлегатам на УНС.

— Калі я даведалася пра гэта, то вельмі расхвалявалася, — расказвае Надзея Пятроўна. — Быць дэлегатам ганарова, гэта значыць, маю працу заўважылі. Першае, аб чым мне б хацелася сказаць на сходзе, — каб у краіне з большай павагай ставіліся да настаўнікаў, цанілі іх працу і не забывалі аб іх, нават калі педагог стаў пенсіянерам. Настаўнікі нясуць добрае і светлае дзецям — гэта вельмі важна. Сёння, як мы бачым, упушчана патрыятычнае выхаванне моладзі. Памятаю, як мой бацька расказваў мне пра вайну, як я плакала... Магчыма, таму маё пакаленне выхавана такім: мы цэнім сваю Радзіму, свой куток.

Дэлегата вельмі хвалюе праблема вымірання маленькіх вёсак. Яна ўсімі сіламі стараецца даглядаць пустуючыя дамы і спадзяецца, што людзі калі-небудзь вернуцца да сваёй зямлі.

— А яшчэ неабходна звярнуць увагу на нашу беларускую мову, больш актыўна папулярызаваць яе, — упэўнена Надзея Пятроўна. — Бо мова — душа нацыі. Без яе, без павагі да помнікаў і ведання сваёй гісторыі не будзе і нас як нацыі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-53647 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 4), общей площадью 110,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Свердлова, 27А.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424350100001000382, площадью 0,0712 га (назначение – обслуживание магазина № 4), расположенном по адресу: г. Новогрудок, ул. Свердлова, 27А.
Начальная цена продажи лота – 35 655,60 руб. (тридцать пять тысяч шестьсот пятьдесят пять рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 3 565 руб. (три тысячи пятьсот шестьдесят пять рублей)

**Продавец – ОАО «Большая Крыница», 231400, г. Новогрудок, ул. Волчецкого, 36а, тел. 8-01597-256-92**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 22 февраля 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 09.12.2020 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 18 февраля 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-24117 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный цех), общей площадью 1002,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Минский тракт, 32Ж.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425450100001009305 (целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания квасильно-засолочного цеха), площадью 0,3377 га по адресу: г. Слоним, ул. Минский тракт, 32Ж.
Начальная цена продажи лота – 142 800 руб. (сто сорок две тысячи восемьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 14 280 руб. (четырнадцать тысяч двести восемьдесят рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец – Слонимский филиал Гроднооблпотребобщества, 231800, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-663-38**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 09 марта 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 04 марта 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

**Информация о деятельности Республиканского благотворительного фонда помощи детям «Подари надежду» за 2020 г.**

Количество учредителей Фонда – 2 человека, из них 2 – физические лица.
Единица измерения – тыс. руб.
Информация о стоимости имущества Фонда «Подари надежду» (далее – Фонд):
- остаточная стоимость основных средств на 31.12.2020 г. составляет 20 800 тыс. руб, в том числе:
- автомобиль «Фольксваген Пассат» 2008 г. в. – 19 500 тыс. руб. (передан в уставный фонд учредителем);
- земельный участок общей площадью 0,25 га – 1300 тыс. руб. (согласно данным Национального кадастрового агентства);
- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 4,715 тыс. руб.
Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда составляет – 5,493 тыс. руб.
в том числе:
a) на выплату заработной платы и прочих социальных выплат сотрудникам – 0,0 тыс. руб.;
b) на оплату налогов и прочих обязательных платежей – 0,0 тыс. руб.;
c) на уставные и благотворительные цели – 5,493 тыс. руб.
Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.
УНП 805003382

22 февраля 2021 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об имуществе общества.
2. О совершении сделок.

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 09.30 до 10.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).
Дата сбора реестра акционеров – 10 февраля 2021 г.
Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 15.02.2021 г., по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400078331

Энергетыка

# БЯСПЕКІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

## Для чаго праводзяцца стрэс-тэсты на атамнай станцыі

**Бяспекі можа быць толькі дастаткова, зашмат яе не бывае, упэўнены айчынныя эксперты атамнай галіны. З гэтай нагоды Беларусь правяла ў 2016—2018 гадах на БелАЭС стрэс-тэсты, хоць станцыя на той момант была яшчэ не гатовая. Паняцце «стрэс-тэсты» ўзнікла пасля таго, як у сакавіку 2011 года ўздзеянне землятрусу і цунамі прывялі да аварыі на АЭС Факусіма-даічы ў Японіі. Як высветлілася пазней, яна мела дэфіцыт бяспекі да экстрэмальных прыродных умоў: ахоўная дамба была на два метры ніжэйшая, чым хваля цунамі. Увесь свет пасля гэтага ўстурбаваўся, што будзе з іншымі атамнымі станцыямі, калі здарыцца падобнае спалучэнне прыродных уздзеянняў. І адказам на тое, што будзе з АЭС, сталі стрэс-тэсты. Еўрапейская група рэгулюючых органаў ядзернай бяспекі ENSREG распрацавала адпаведную працэдуру, якую правялі для ўсіх дзеючых у Еўропе АЭС. Для чаго патрэбны стрэс-тэсты, расказалі эксперты падчас прэс-канферэнцыі ў БелТА.**




### Экстрэмальнае надвор'е, страта цепланосьбіта, цяжкія аварыі

Існуюць патрабаванні, устаноўленыя для розных паняццяў, звязаных з бяспекай. Калі ўзнікае сітуацыя, што той ці іншы параметр ці кампанент на Беларускай АЭС не адпавядае патрабаванням МАГАТЭ або нацыянальнага заканадаўства, такое становішча называецца дэфіцытам бяспекі, і яго трэба выпраўляць. Калі ж параметры, наадварот, перавышаюць з запасам устаноўленыя патрабаванні, то такая сітуацыя называецца запасам бяспекі, расказаў **Алег СОБАЛЕЎ, кансультант Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд):**

— Калі гаворка ідзе пра стрэс-тэсты, то іх мэта — вызначыць дэфіцыт бяспекі, а выні               якраз і з'яўляюцца дадатковай мерай па павышэнні існуючай бяспекі і яе запасаў. Першым этапам стрэс-тэстаў для БелАЭС стала самаацэнка, якую правяла станцыя. Другім — нацыянальная ацэнка па даручэнні ўрада пад агульным кіраўніцтвам Дзяржатамнагляда. Трэцім — партнёрская праверка, якую правяла экспертная група ENSREG.

**Па выніках стрэс-тэстаў дэфіцыту бяспекі на БелАЭС не знойдзена, а для выканання шэрагу мерапрыемстваў нацыянальнага плана прыярытэтнымі абраны тыя, што павышаюць надзейнасць эксплуатацыі АЭС ва ўмовах запраектных аварый.**

У 2019-м з'явіўся нацыянальны план дзеянняў па выніках правядзення стрэс-тэстаў. Ён уключыў у сябе мерапрыемствы, пры падрыхтоўцы якіх былі ўлічаны прапановы і рэкамендацыі па павышэнні бяспекі з усіх трох стадый тэстаў. Нацыянальны план утрымлівае 23 мерапрыемствы, два з якіх адміністрацыйныя, 21 — змястоўнае. Гэтыя мерапрыемствы разбітыя, як і самі стрэс-тэсты, на тэмы.

— Першая тэма: паводка і землятрус: экстрэмальныя ўмовы надвор'я, — абазначыў Алег Собалеў. — У межах гэтай тэмы аналізуецца, як будзе рэагаваць станцыя на пэўныя прыродныя ўздзеянні і іх спалучэнні. Другая тэма: страта цеплазабеспячэння і цепланосьбіта. Тут дапускаецца гіпатэтычная здагадка, што падчас прыроднага катаклізму адбудзецца абясточванне станцыі і будзе страчаны цепланосьбіт (субстанцыя, якая адводзіць цяпло з актыўнай зоны рэактара). Трэцяя тэма: кіраванне цяжкімі аварыямі. Разглядаецца магчымасць цяжкай аварыі пасля прыроднага катаклізму і страты цепланосьбіта.

### Сейсмічная бяспека ў 300-кіламетровай зоне

Найбольш абмяркоўваемае па першай тэме пытанне ў дачыненні да БелАЭС — сейсмічная бяспека, хоць Беларусь у гэтым плане — адно з самых спакойных месцаў на Зямлі. Тым не менш цяпер усе АЭС будуюцца з улікам сейсмічнага ўплыву мінімум у сем балаў.

У межах выканання мерапрыемстваў запланавана ў прыватнасці далейшае вывучэнне Гудагайскага землятрусу 1908 года. Хоць пацвердзіць яго наяўнасць інструментальна не атрымалася, аднак аспрэчваць яго факт таксама нельга.

— Прадугледжаны і работы па ацэнцы актыўнасці Ашмянскага разлому і аптымізацыі сеткі сейсмічнага кантролю, які цяпер існуе ў раёне станцыі, — удакладніў **Аркадзь АРОНАЎ, загадчык геафізічнай абсерваторыі Цэнтра геафізічнага маніторынгу Нацыянальнай акадэміі навук.** — Адно з мерапрыемстваў прадугледжвае развіццё гэтай сеткі, мадэрнізацыю і перавод яе ў разрад стацыянарных, каб сачыць за геадынамічнай стабільнасцю асяроддзя на ўсіх этапах эксплуатацыі станцыі і вываду з яе. Цяпер сетка пакуль часовая, якая рэгламентуецца нарматыўнымі дакументамі на этап праектавання і будаўніцтва АЭС.

Яшчэ адно мерапрыемства звязана з актуалізацыяй каталога сейсмічных з'яў у 300-кіламетровай зоне вакол пляцоўкі АЭС, каб паглядзець па выніках маніторынгу апошніх гадоў, ці ёсць змены ў асяроддзі. Забеспячэнне доступу навуковай грамадскасці замежных краін да матэрыялаў, якія атрыманы па даных сейсмалагічнага кантролю.

За гэты час, акрамя навуковай работы па даследаванні Гудагайскага землятрусу, Інстытут фізікі зямлі (Санкт-Пецярбург, Расія) выканаў работу па будаванні новых сейсмічных крывых. На падставе апошняга падрыхтавана новая версія сейсмічнага імавернага аналізу бяспекі, дадаў Алег Собалеў.

### Альтэрнатыўнае электрасілкаванне і рэзервовая помпа

Па выніках стрэс-тэстаў дэфіцыту бяспекі на БелАЭС не знойдзена, а для выканання шэрагу мерапрыемстваў нацыянальнага плана прыярытэтнымі абраны тыя, што павышаюць надзейнасць эксплуатацыі АЭС ва ўмовах запраектных аварый, заявіў **Мікалай КАРПЕНКА, вядучы інжынер аддзела надзейнасці і аналізу бяспекі ДП «Беларуская АЭС»:**

— Яшчэ адзін вынік стрэс-тэстаў — вызначэнне абласцей, дзе можна дадаткова павысіць бяспеку ў дачыненні да пэўных параметраў. Мы ўжо даўкамплектавалі нашы блокі АЭС дадатковай перасоўнай дызель-генератарнай установкай. Падчас аварыйных сцэнарыяў у самых неспрыяльных умовах яна забяспечвае электрасілкаванне асобнага абсталявання. Гэта дазваляе прадоўжыць работу пасіўных сістэм бяспекі. Гаворка ідзе пра запаўненне бакаў аварыйнага адвядзення цяпла сістэмы пасіўнага адводу цяпла ад парагенератараў і герметычнай абалонкі.

Адносна верагоднай поўнай страты цеплазабеспячэння і цепланосьбіта на АЭС у нацыянальным плане абазначана два моманты. Мэтазгоднасць абсталявання станцыі альтэрнатыўнай крыніцай электрасілкавання для запраектных аварый (гэтае мерапрыемства лічыцца выкананым). Ацэнка павышэння надзейнасці сістэмы пасіўнага адводу цяпла і ўстаноўкі дадатковай (рэзервовай) помпы. Гэтае мерапрыемства на БелАЭС зрабілі па-свойму, паведаміў **Віген МАРУХЯН, начальнік упраўлення рэгулявання ядзернай бяспекі Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд).**

Еўрапейскія калегі прапанавалі ўстанавіць рэзервовую помпу, якая дублiравала б ужо існуючую. З дапамогай гэтай помпы прадоўжыцца работа пасіўных сістэм бяспекі, якія ва ўмовах самых экстрэмальных з'яў уводзяцца ў работу пасіўна — без удзелу аператара — на працягу часу, дастатковага для аднаўленчых работ, растлумачыў Мікалай Карпенка:

— У праекце прадугледжана дадатковае рэзерваванне функцый помпы. Быў праведзены аналіз па павышэнні надзейнасці функцыянавання абсталявання пасіўных сістэм бяспекі пры ўмове выкарыстання рэзервовай помпы або альтэрнатыўнага варыянта — звычайных пажарных машын. У выніку найбольш эфектыўным і надзейным ва ўмовах запраектных аварый і ізаляцыі пляцоўкі аказалася выкарыстанне менавіта пажарнай тэхнікі, з дапамогай якой мы можам падтрымліваць бяспечны стан ядзернай установкі.

**Калі гаворка ідзе пра стрэс-тэсты, то іх мэта — вызначыць дэфіцыт бяспекі, а вынікі якраз і з'яўляюцца дадатковай мерай па павышэнні існуючай бяспекі і яе запасаў. Першым этапам стрэс-тэстаў для БелАЭС стала самаацэнка, якую правяла станцыя. Другім — нацыянальная ацэнка па даручэнні ўрада пад агульным кіраўніцтвам Дзяржатамнагляда. Трэцім — партнёрская праверка, якую правяла экспертная група ENSREG.**

Да трэцяй тэмы нацыянальнага плана (кіраванне цяжкімі аварыямі) і ў еўрапейскіх, і ў айчынных экспертаў было найменш пытанняў, запэўнілі спецыялісты. Існуюць два падыходы: падзейны і сістэмна-арыентаваны, як апісваць дзеянне персаналу ва ўмовах цяжкіх аварый на АЭС. На беларускай станцыі еўрапейскія эксперты прапанавалі падрыхтаваць праграму работ па сістэмна-арыентаваных працэдурах, паведаміў Віген Марухян:

— У выніку інструкцыя па кіраванні цяжкімі аварыямі будзе распрацавана ў сістэмна-арыентаванай форме, што і было зроблена праектным блокам, разгледжана эксплуатуючай арганізацыяй, Дзяржатамнаглядам. Сёння персанал станцыі ўжо прымяняе такія працэдуры, так што гэты пункт нацыянальнага плана можна лічыць выкананым. Хоць падобныя працэдуры на любой станцыі ўкараняюцца цягам 5—10 гадоў.

Тэрмін рэалізацыі ўсіх мерапрыемстваў нацыянальнага плана разлічаны да 2025 года.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Будзь у курсе!

## На першы рэйс цягніка — больш чым 230 білетаў

**Беларуская чыгунка на першы рэйс цягніка № 2 Мінск — Масква рэалізавала 236 квіткоў. У адваротным кірунку на цягнік № 1 Масква — Мінск пасажыры набылі 229 квіткоў.**

Нагадаем, што 8 лютага ў 22.10 у першую паездку з Мінска ў Маскву выправіўся фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква.

У сталіцу Расійскай Федэрацыі ён прыбыў у 8.13 наступных сутак. У адваротным кірунку з Масквы цягнік адправіцца 9 лютага ў 22.13 і прыбудзе ў Мінск 10 лютага ў 7.26. Далей з Мінска ён будзе курсіраваць па цотных, а з Масквы па няцотных днях.

У прэс-цэнтры магістралі звярнулі ўвагу, што асобам, якія прыбываюць у Расійскую Федэрацыю з-за мяжы чыгуначным транспартам, неабходна прадставіць даведку пра абследаванне на COVID-19 з адмоўным вынікам лабараторнага абследавання метадам ПЛР, выдадзеную не пазней чым за тры дні да даты перасячэння Дзяржаўнай граніцы Расійскай Федэрацыі. Выключэнне складаюць дзеці ва ўзросце да пяці гадоў (пры наяўнасці даведкі ў суправаджаючых асоб), члены ўрадавых дэлегацый дзяржавы — члена ЕАЭС пры вяртанні ў краіну грамадзянства, члены лакаматыўных брыгад і асобы, звязаныя з перавозачнай дзейнасцю на чыгуначным транспарце.

Замежныя грамадзяне, якія дасягнулі шасцігадовага ўзросту, што прыбываюць на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь (выключэнне складаюць грамадзяне, якія маюць дазвол на пастаяннае або часовае пражыванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь), таксама павінны мець пры сабе арыгінал або копію медыцынскага дакумента на папяровым носьбіце ці ў электронным выглядзе, які пацвярджае адмоўны вынік лабараторнага даследавання на інфекцыю COVID-19, выкананага не пазней чым за трое сутак да даты перасячэння Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, пасажырам настойліва рэкамендавана выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай аховы органаў дыхання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Саід ЯРЫ:

# «Шукаць пункты судакранання...»

**Размова — пра сучаснасць і перспектывы ў развіцці беларуска-іранскіх адносін. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Ірана ў Рэспубліцы Беларусь спадаром Саідам Яры**

***— Глыбокапаважаны спадар пасол, час бяжыць даволі хутка. Вы працуеце ў Беларусі ўжо не адзін месяц. Якія галоўныя ўражанні за гэты перыяд сфарміраваліся ў вас пра нашу краіну?***

— Перш-наперш, хацеў бы падзякаваць вашаму аўтарытэтнаму выданню за ўвагу да Ірана і беларуска-іранскіх сувязяў. Прайшло, сапраўды, каля года з моманту пачатку маёй дыпламатычнай місіі ў дружалюбнай і прыгожай краіне Беларусь. Я прыехаў у Мінск 29 студзеня 2020 года.

Кажучы па праўдзе, без усялякага перабольшвання, за гэты час я пабачыў беларускі народ надзвычай культурным, добрым і шчырым. Наступнае, што прыцягвае маю ўвагу ў Беларусі — вельмі высокі ўзровень бяспекі ў краіне. Пытанне бяспекі і пачуццё абароненасці — адно з самых важкіх пытанняў для любога грамадства.

І яшчэ. Я знаходжу Мінск надзіва вельмі прыгожым і чыстым горадам з непадзельна сімпатычнымі і прыемнымі воку пейзажамі.

***— Што вы ўжо паспелі адкрыць у нашай краіне? Дзе пабывалі за час кіраўніцтва дыпламатычнай місіяй Ірана ў Беларусі?***

— Нягледзячы на ўмовы, выкліканыя эпідэміяй COVID-19, я імкнуўся разам з сям'ёю наведаць усе прыкметныя мясціны Мінска. У межах сваёй місіі я таксама стараўся наведаць культурныя і мастацкія цэнтры Мінска. Мой першы афіцыйны візіт адбыўся ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Паважаны генеральны дырэктар бібліятэкі Раман Сцяпанавіч Матульскі цёпла сустрэў мяне і суправаджаў у час усяго візіту. Прыгожы будынак і яго унікальная архітэктура мяне вельмі ўразілі. Супрацоўнікі бібліятэкі паказалі мне старыя кнігі на персідскай мове. Не чакаў пабачыць такія адметныя творы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

У маіх планах было наведванне беларускіх ВНУ. Перш-наперш я наведаў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Там я добра пазнаёміўся з навуковым патэнцыялам, метадамі навучання, магчымасцямі лабараторый і абсталяваннем універсітэта. Паважаны рэктар універсітэта, яго прарэктар па міжнародных справах і дэкан факультэта замежных студэнтаў БДМУ суправаджалі мяне ў час майго візіту. Варта адзначыць, што многія іранскія студэнты, а гэта каля 400 чалавек, вучацца ў сучасны момант у гэтым універсітэце на такіх розных спецыяльнасцях, як медыцына, стаматалогія і фармацэўтыка.

Наступны візіт быў на факультэце філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе я сустрэўся з дэканам і прафесарамі ўніверсітэта. У нас дасягнуты добрыя дамоўленасці пра стварэнне кабінета ісламскай філасофіі і спадзяюся, што мы зможам гэта рэалізаваць. У час гэтага візіту я перадаў бібліятэцы факультэта ў падарунак каля 50 тамоў кніг іранскіх філасофаў і сацыёлагаў, перакладзеных на рускую мову.

Я таксама наведаў факультэт міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і цэнтр іраназнаўства і персідскай мовы на факультэце. Там я сустрэўся з дэканам і прафесарамі факультэта, а таксама са студэнтамі і адказаў на мноства іх пытанняў. Сустрэча і стасункі з выкладчыкамі



персідскай мовы і студэнтамі, якія вывучаюць персідскую мову, былі для мяне надзвычай цікавымі і пакінулі вельмі добрыя ўспаміны. Абсталяванне і падтрымка цэнтра іраназнаўства кафедры мовазнаўства і краіназнаўства Усходу ФМА БДУ з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці нашага пасольства.

***— Сённяшні стан беларуска-іранскіх адносін... На чым асабіста вы сканцэнтраваны ў іх умацаванні ў цяперашні час?***

— Ісламская Рэспубліка Іран разглядае магчымасць усталявання ўсёабдымных і збалансаваных адносін з Беларуссю. Таму мы аддаём увагу развіццю і ўмацаванню ўсіх аспектаў адносін. Аднак максімальнае пашырэнне эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі з'яўляецца першачарговай задачай пасольства. Эканамічныя і гандлёвыя магчымасці Ірана і Беларусі ўзаемна дапаўняльныя. Беларусь з'яўляецца членам Еўразійскага эканамічнага саюза, а Іран падпісаў з ЕАЭС прэферэнцыяльнае гандлёвае пагадненне, якое ўступіла ў сілу 27 кастрычніка 2020 года. ЕАЭС — вельмі важная платформа для павелічэння гандлю паміж дзвюма краінамі. Абапіраючыся на гэта, мы можам думаць пра вялікія і дальнабачныя мэты ў галіне гандлю. Канешне ж, аднаго гэтага недастаткова. Мы павінны падрыхтаваць неабходную інфраструктуру. Наладжванне прамых рэйсаў паміж дзвюма краінамі і спрашчэнне візавага рэжыму для дзелавых людзей, а таксама механізмы банкаўскага абмену тут вельмі важныя.

Таксама пасольства аддае асаблівую ўвагу развіццю адносін дзвюх краін у сферы гуманітарных сувязяў, умацаванню навукова-акадэмічнага і культурна-мастацкага ўзаемадзеяння паміж імі. Вельмі важна павышаць веданне двух народаў адзін пра аднаго. Гэта фундаментальная і карпатлівая праца.

***— У многім характар адносін дзвюх краін вызначаецца ўзроўнем эканамічных сувязяў. Як вы ацэньваеце іх сучасны стан? У чым бачыце рэзервы для павелічэння гандлёвага абароту паміж Беларуссю і Іранам?***

— Існуе велізарны патэнцыял для павышэння ўзроўню эканамічных і гандлёвых адносін паміж дзвюма краінамі. На вялікі жаль, гэты патэнцыял пакуль што яшчэ не рэалізаваны. Аб'ём гандлёвага абароту паміж Іранам і Беларуссю вельмі нізкі. Развіваючы супрацоўніцтва ў галіне прамысловасці, высокіх тэхналогій, энергетыкі і сельскай гаспадаркі, мы можам спадзявацца на павелічэнне гандлёвага абароту паміж нашымі краінамі. Справа ў тым, што ўзровень эканамічных і гандлёвых адносін дзвюх краін далёкі ад узроўню палітычнага супрацоўніцтва. Асабіста я лічу, што ўзровень гандлёвага абароту можна павялічыць да 200 мільёнаў долараў у год.

***— І відавочнымі тут падаюцца згаданыя вамі раней крокі — і авіярэйс, і іншыя міжбанкаўскія стасункі, і іншая візавая палітыка...***

— Так. І гэта першачарговыя прыярытэты. Для дасягнення гэтых важных мэт былі зроблены многія крокі і праведзены розныя сустрэчы, сярод якіх хацелася б адзначыць наступныя: праведзены сустрэчы з паважанымі міністрамі прамысловасці, энергетыкі, сельскай гаспадаркі Беларусі, на якіх мы абмеркавалі шляхі ўмацавання супрацоўніцтва; я двойчы сустракаўся са старшынёю Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. У рамках гэтых сустрэч мы абмеркавалі, як актывізаваць узаемадзеянні паміж прыватнымі сектарамі дзвюх краін. Я наведаў холдынгі «Амкадор», «БелАЗ», «МАЗ», а таксама правёў канструктыўныя перамовы і кансультацыі з іх кіраўнікамі. Дарэчы, мы арганізавалі зусім нядаўна візіт дэлегацыі ААТ «МАЗ» у Іран для правядзення сустрэч і кансультацый са сваімі партнёрамі.

***— Гуманітарнае супрацоўніцтва паміж Іранам і Беларуссю... Наколькі яно з'яўляецца значным складнікам двухбаковых адносін паміж нашымі краінамі?***

— Гуманітарнае супрацоўніцтва — важкая і значная частка супрацоўніцтва нашых краін на міжнародным узроўні. Павінен падкрэсліць, што паміж нашымі краінамі існуюць цесныя і канструктыўныя кансультацыі і супрацоўніцтва ў галіне гуманітарных пытанняў і правоў чалавека. Дзве краіны заўсёды падтрымлівалі пазіцыі адна адной у міжнародных арганізацыях. У гэтай сферы паміж дзвюма краінамі існуе ўзаемаразуменне. Вы ведаеце, што, на вялікі жаль, і Беларусі, і Ірану пад падманлівымі нагодамі прад'яўляюцца несправядлівыя абвінавачванні ў парушэнні правоў чалавека. Гэта кошт нашай незалежнасці. Злучаныя Штаты і Еўропа выкарыстоўваюць правы чалавека як інструмент ціску на Мінск і Тэгеран. Пра гэта ведае ўвесь свет. Падвойныя заходнія стандарты ў галіне правоў чалавека і барацьбы з тэрарызмам відавочныя.

Злучаныя Штаты бессаромна праводзяць палітыку дзяржаўнага тэрарызму і санкцый супраць Ірана насуперак усім прынятым нормам міжнароднага права. У апошнія месяцы Еўропа і ЗША ўвялі некалькі пакетаў санкцый супраць Беларусі. ЗША і Еўропа любяць умешвацца ва ўнутраныя справы незалежных краін. Умяшанне ва ўнутраныя справы іншых краін стала іх пастаяннай палітыкай. Незалежныя краіны павінны аб'ядноўвацца, каб супрацьстаяць іх умяшанням.

> **«Ісламская Рэспубліка Іран разглядае магчымасць усталявання ўсёабдымных і збалансаваных адносін з Беларуссю. Таму мы аддаём увагу развіццю і ўмацаванню ўсіх аспектаў адносін. Аднак максімальнае пашырэнне эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі з'яўляецца першачарговай задачай пасольства».**

***— У Беларусі, як і ўвогуле на постсавецкай прасторы добра ведаюць імя Умара Хаяма. З творчасцю якіх іншых пісьменнікаў Ірана хацелася б пазнаёміць чытачоў Беларусі?***

— Увесь свет ведае Іран па яго старажытнай і бліскучай гісторыі і цывілізацыі, а таксама па яго багатай літаратуры. Іранскія паэты вядомыя ва ўсім свеце. Умар Хаям — адзін з іх. Яго шануюць многія прыхільнікі ў рускамоўных краінах і на ўсёй постсавецкай прасторы. Мне хацелася б, каб надышоў той дзень, калі сяброўскі народ Беларусі бліжэй пазнаёміўся з Абулькасімам Фірдаўсі і яго бессмяротным творам «Шахнамэ», а таксама з Джалалуддзінам Малаві (Румі), Хафезам Шыразі, Саадзі Шыразі, Атарам Нешапуры і Нізамі Ганджэві. Гэта вечна зіхоткія зоркі на небасхіле персідскай літаратуры.

***— Іран пастаянна ўдзельнічае ў мінскіх міжнародных кніжных выстаўках-кірмашах. Ці будзеце ўдзельнічаць у гэтым, 2021 годзе? Якія навацыі чакаюць наведвальнікаў іранскага стэнда на кніжнай выстаўцы сёлета?***

— Удзел у міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы — гэта знакавая падзея для нас. Штогод кніжная выстаўка — цудоўная магчымасць, якая даецца ўрадам Беларусі для прэзентацыі апошніх выдадзеных у Іране кніг і іншых друкаваных і мастацкіх твораў розных краін.

Сёлета, як і ў папярэднія гады, мы плануем у экспазіцыі Ірана прадставіць усім ахвотным найноўшыя персідскія творы, перакладзеныя на рускую мову.

З навінак гэтага года ў экспазіцыі Ірана магу адзначыць прысутнасць іранскага каліграфа і мастака, якія прадэманструюць мастацтва каліграфіі і іранскага жывапісу проста на іранскім стэндзе. Таксама да нас завітаюць беларускія і іранскія маладыя вучоныя, якія пазнаёмяць усіх ахвотных з творамі іранскай літаратуры.

***— Меркаванні, уяўленні пра іншую краіну ў грамадзян другой дзяржавы фарміруюць масмедыя, сродкі масавай інфармацыі, сацыяльныя сеткі. Што, на ваш погляд, трэба зрабіць, каб у Беларусі болей ведалі Іран, а ў Іране — Беларусь?***

— Сёння тэма інфарміравання з'яўляецца надзвычайным пытаннем. СМІ адыгрываюць асаблівую ролю ў фарміраванні грамадскай думкі. Гэты факт бясспрэчны. Краіны спрабуюць выкарыстоўваць усе віды СМІ для кантролю грамадскай думкі і праўдзення актыўнай медыяпалітыкі. Можна сказаць, што найбольшы ўплыў на грамадскую думку аказваюць сацыяльныя сеткі. У іх рэзка павялічылася хуткасць абмену інфармацыяй.

У мэтах павышэння ўзаемаразумення паміж народамі Ірана і Беларусі неабходна ўмацоўваць супрацоўніцтва ў галіне сродкаў масавай інфармацыі (тэлебачанне, радыё, газеты, віртуальная прастора) і сувязяў з грамадскасцю паміж дзвюма краінамі. У апошнія гады былі зроблены крокі па супрацоўніцтве паміж радыё і тэлебачаннем Ісламскай Рэспублікі Іран і Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Рэспублікі Беларусь, а пасольства Ірана імкнецца ўмацаваць гэта супрацоўніцтва.

Праўдзенне ўзаемных культурных тыдняў паміж Іранам і Беларуссю ў Мінску і Тэгеране можа быць вельмі эфектыўным у плане паглыблення ведаў двух народаў адзін пра аднаго. Можна наватпайсці далей — і распрацаваць шырокую праграму мерапрыемстваў у рамках года культуры паміж Іранам і Беларуссю.

**Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.**

# КАЛІ НЕ БІБЛІЯТЭКІ, ТО ХТО?

## Рэестр кніжных помнікаў можа пашырыць кожны

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі прэзентавала новы культурніцкі праект — Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў. Работа па распрацоўцы яго канцэпцыі вялася на працягу трох гадоў — і вось, у пачатку 2021-га, была паспяхова скончана.**


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь — гэта вялікі інтэрактыўны спіс, які уключае ў сябе і бібліяграфічныя звесткі аб помніку, і тлумачэнні экспертаў. Акрамя таго, распрацаваны рэестр дазваляе ўбачыць кнігу «ўжывую»: вядзецца работа над поўнай алічбоўкай. Ва ўсім свеце гэта тэхналогія цэніцца вельмі высока: як згадала ўдзельніца прэзентацыі, **сакратар Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Наталля ШАСНОВІЧ**, каб атрымаць адсканаваныя версіі некаторых кніжных помнікаў, што знаходзяцца, скажам, у Швецыі, неабходна заплаціць ажно 200 еўра. Дакументы, якія алічбоўка нашы спецыялісты, зразумела, будуць для беларусаў куды больш даступныя.

Трэба адзначыць, што работа над праектам была не толькі інтэлектуальная, але і тэхнічная. На сайце рэестра ёсць інтэрактыўная карта: вы можаце націснуць на любы рэгіён і атрымаць інфармацыю аб яго фондзе і кніжных помніках, якія ён захоўвае. Акрамя камп'ютарнай версіі сайта, адначасова была распрацавана і мабільная, каб доступ да фонду быў хуткі і зручны.

Так, на прэс-канферэнцыі прагучала, што рэестр створаны. А ці будзе ён пашырацца, і калі будзе, то якім чынам? На гэтыя пытанні адказаў **намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША.** Канешне ж, рэестр будзе расці. І, што самае цікавае, кожны з нас зможа ўзяць удзел у дадзеным працэсе. Гэта вельмі падобна на тое, як працуе «Вікіпедыя»: змясціць інфармацыю можа кожны. Калі вам здаецца, што вы валодаеце каштоўнай кнігай, вам трэба толькі зайсці на сайт, націснуць кнопку «У мяне ёсць кніжны помнік» і пакінуць заяўку. Таксама вельмі важны момант, на які звярнуў увагу Алесь Суша: адбор будзе максімальна празрыстым. Гэта значыць, што рашэнне аб тым, трапіць кніга ў рэестр ці не, будзе залежаць ад спецыяльна створанай камісіі, ў якую абавязкова ўвойдуць рэгіёны Беларусі. Такім чынам, за адбор заявак будзе адказваць адразу вялікая колькасць экспертаў.

Не проста так было адзначана, што стварэнне рэестра кніжных помнікаў — гэта культурніцкі праект. Такая ініцыятыва звяртае нашу ўвагу адразу на некалькі важных рэчаў. Па-першае, дае магчымасць зразумець, якой велізарнай колькасцю старажытных і каштоўных кніг мы насамрэч валодаем. Па-другое, дапамагае бібліятэкам і музеям захоўваць нашу культурную спадчыну (напрыклад, інфармацыя не будзе страчана з-за неспадзяванасцяў накшталт пажару). Такім чынам, намаганнямі вялікай колькасці людзей быў распрацаваны яшчэ адзін праект, што ўмацоўвае беларускую самасвядомасць.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# Творцы аднаго часу і адной зямлі

## Што яднала і адрознівала Шамякіна і Мележа

**У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры 8 лютага 2021 года адкрылася літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Ад палескіх імхоў да асвейскіх крыніц...», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Івана Шамякіна і Івана Мележа.**

Гэтыя пісьменнікі маюць шмат агульнага. Абодва нарадзіліся на Палессі, абодва сталі народнымі пісьменнікамі і класікамі яшчэ пры жыцці... Якраз пра тое, што аб'ядноўвае двух выдатных майстроў слова, і расказвае новая экспазіцыя ў музеі гісторыі беларускай літаратуры.

— Наша выстаўка называецца «Ад палескіх імхоў да асвейскіх крыніц...», гэтак жа называецца раздзел эсэ «Зямля пад белымі крыламі» Уладзіміра Караткевіча. У аснову часовай літаратурна-дакументальнай экспазіцыі пакладзены ўспаміны Івана Пятровіча Шамякіна «Палёт над Палессем», прысвечаныя Івану Мележу. Яны надрукаваныя ў кнізе «Карэнні і галіны» ў 1986 годзе. Прачытаўшы іх, мы вырашылі, што цікава было б паказаць кожнага з юбіляраў як асобу, як чалавека, іх адносіны да калег-пісьменнікаў, да крытыкі сваіх твораў, і тым самым даць магчымасць зразумець, чым яны падобныя, а ў чым адрозніваюцца, — расказвае **вядучы навуковы супрацоўнік навукова-экспазіцыйнага аддзела Паліна ТАЎГЕН.** — Выстаўкі, прысвечаныя Івану Шамякіну, у нас неаднойчы ладзіліся, таму і матэрыялаў назбіралася. Складаней было з тым, каб болей даведацца пра Івана Мележа, таму што яго архіва ў нас няма. А тыя матэрыялы, якія маем, трапілі да нас з архівамі іншых пісьменнікаў. Таму ў нас ёсць кнігі з аўтографамі, фотаздымкі, ліст Івана Паўлавіча пра выхад кнігі Васіля Быкава «Трэцяя ракета», дзе Мележ адзначае значнасць гэтага твора. Але цікава даведацца пра тое, як Іван Мележ і Іван Шамякін пазнаёміліся, калі пасябравалі, сталі суседзямі па кватэрах, па дачах. І вельмі часта ў іх адбываліся цёплыя гутаркі, калі абмяркоўвалі літаратуру альбо нешта пабытавае. У многім, вядома, іх погляды разыходзіліся, напрыклад у тым, што датычылася грамадскай дзейнасці. Цікавыя ўспаміны, хоць пісаліся яны ўжо пасля таго, як Івана Мележа не стала. Адчуванне, быццам Іван Шамякін падбіраў кожнае слова, каб не пакрыўдзіць памяць свайго сябра і калегі. І гэта дарагога варта.



Выстаўка будзе дзейнічаць да 16 жніўня бягучага года. Дарэчы, наведаць яе да пачатку сакавіка можна па ўмовах акцыі «Музей і тэатр побач», якую распачалі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача. Па яе ўмовах, наведаўшы з 3 лютага да 28 лютага 2021 года Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, вы атрымліваеце купон на 50 %-ную зніжку на наведванне пастаяннай і часовых экспазіцый Музея гісторыі беларускай літаратуры да 10 сакавіка 2021 года. На экскурсійнае абслугоўванне зніжка не распаўсюджваецца.

**Алена ДРАПКО.**

# Маляваць зніклыя храмы, шукаць мяжу паміж небам і зямлёй

**Як мяняецца і чым жыве сёння беларускае выяўленчае мастацтва, з якімі вынікамі прайшлі вядомыя арт-форумы: Міжнародны фестываль «Арт-Мінск», Трыенале жывапісу, графікі і скульптуры і праект «Графіка года», і ці будзе працяг — пра гэта прадстаўнікі Саюза мастакоў і самі творцы пагаварылі на нядаўняй сустрэчы з журналістамі.**

Вышэйназваныя праекты прайшлі ў сталіцы ў канцы мінулага года. Работы мастакоў з Беларусі, Славакіі, Эстоніі можна было ўбачыць на самых розных выставачных пляцоўках. У канцы фестывалю журы, у складзе якога былі мастацтвазнаўцы, вызначыла пераможцаў сярод удзельнікаў Трыенале і праекта «Графіка года». Найвышэйшай адзнакі — Гран-пры І Трыенале жывапісу, графікі і скульптуры — удастоена работа «Плашчаніца» маладой мастачкі Кацярыны Сумаравай. Скульптар Канстанцін Селіханаў перамог у намінацыі «Скульптура». У намінацыі «Жывапіс» найлепшым прызналі мастака Васіля Касцючэнку. Першы прыз у намінацыі «Графіка» дастаўся мастаку з Гродна Юрыю Якавенку. Што да вынікаў праекта «Графіка года», то тут у намінацыі «Арыгінальная графіка» першае месца прысудзілі Валерыі Каўзановіч, а ў намінацыі «Друкаваная графіка» — Марыі Кашалёвай-Ліхоцке.

— Мы вельмі рады, што ў канцы мінулага года нам удалося ажыццявіць праект, які для сябе мы назвалі І Трыенале жывапісу, графікі і скульптуры. Выбраўшы фармат правядзення адзін раз на тры гады, мы будзем прэзентаваць класічныя віды мастацтва. Наступнае трыенале хочам прысвяціць канцэптуальнаму мастацтву. І праз год чакаецца яшчэ адно трыенале, якое будзе прысвечана дэкаратыўна-прыкладному мастацтву. Такі фармат дазволіць Беларускаму саюзу мастакоў ахапіць самыя розныя віды, кірункі і жанры выяўленчага мастацтва, — адзначае **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Аб'яднаўшы праекты І Трыенале жывапісу, графікі і скульптуры, праект «Графіка года» і міжнародны фестываль «Арт-Мінск», мы ў выніку атрымалі цудоўнае свята мастацтва, якое цёпла прыняла публіка. Гледачы ацанілі такі фармат і, нягледзячы на складаныя пандэмічныя ўмовы, што былі ў канцы мінулага года, нашы выстаўкі наведвала каля 300 чалавек у дзень. І гэта сведчыць пра тое, што цікавасць да мастацтва ёсць, людзям хочацца гаварыць пра яго, глядзець і ацэньваць.

Нядаўна ў Палацы мастацтваў адкрылася экспазіцыя, дзе прэзентаваны лаўрэаты Трыенале і праекта «Графіка года», але ў больш разгорнутым фармаце і з большай колькасцю новых работ. Там можна наведаць асобныя творчы праект Кацярыны Сумаравай «Памежны стан». У экспазіцыі прадстаўлены работы з цыклаў «Суб'ектыўны краявід», «Памежны стан», «Рэзервуарыум», а таксама з новай нізкі-рэфлексіі «Плашчаніца». Там жа знаходзяцца работы Васіля Касцючэнкі, Таццяны Радзівілкі,


Фота БелТА.

Аляксандра Даманава, Юрыя Якавенкі, Юрыя Тарэева, Уладзіміра Шапавалава, Канстанціна Селіханава, Сяргея Аганава, Аляксандра Сакалова.

Цікава будзе наведаць і праект «Святло зямлі, святло нябёсаў...» **мастачкі-графіка Ларысы ЖУРАВОВІЧ** з Бялыніч.

— Мастаку, які ўсё жыццё жыве ў правінцыі, вельмі важна мець магчымасць выстаўляцца на сталічнай пляцоўцы, — гаворыць Ларыса Журавовіч. — І ў мяне, дзякуючы Саюзу мастакоў, такая магчымасць з'явілася. Юбілейная выстаўка — гэта звычайна нейкая рэтраспектыва, дзе можна прадставіць работы розных перыядаў. Але ў мяне выпадку мы ўсё зрабілі крыху інакш. Я прадстаўляю серыю, якая створана за мінулыя пяўтара года. Выстаўка называецца «Святло зямлі, святло нябёсаў...». І вядома, не варта ўспрымаць назву літаральна. Мяне хвалявала тэма духоўнасці і душэўнасці. Бо гэта тыя тонкія матэрыі, якія зрокава вельмі складана выявіць. Тэма прымусіла мяне зрабіць экскурс у гістарычнае мінулае сваёй малой радзімы, — дзеліцца мастачка Ларыса Журавовіч. — Пачала даследаваць хрысціянскае жыццё ў нашым рэгіёне, якія ў той час былі помнікі. І ў выніку доўгіх пошукаў высветліла, што было 16 хрысціянскіх храмаў, з якіх засталося толькі два, прычым у перабудаваным выглядзе. Звярнулася да энцыклапедый, а там аніякіх звестак. Тады мы з мужам аб'ездзілі амаль усе вёскі, каб пагаварыць з пажылымі людзьмі і з дапамогай іх успамінаў зразумець, як выглядалі гэтыя цэрквы. На жаль, выгляд двух помнікаў аднавіць так і не ўдалося. Увогуле мая выстаўка атрымалася шматжанравая, бо там прадстаўлены партрэты, нацюрморты і шмат іншага. Але ўсе іх аб'ядноўвае мая спроба знайсці адказы на пытанне: дзе заканчваецца зямля і пачынаецца неба? Я бачу праяўленне гэтага ў вачах людзей, у іх працы на зямлі, у намаляваных нацюрмортах — усюды я бачу праўобраз зямнога раю. Гэтая духоўная сувязь паміж нашым жыццём і небам для мяне асабліва прывабная. І спадзяюся, што вынікі маіх пошукаў вы зможаце ўбачыць на маёй персанальнай выстаўцы.

Таксама ў планах Беларускага саюза мастакоў — шэраг цікавых мерапрыемстваў на бягучы год. Як распавёў **намеснік старшыні па творчых і агульных пытаннях Беларускага саюза мастакоў Андрэй БАСАЛЫГА**, сёлета варта чакаць правядзення чатырох маштабных праектаў, сярод якіх фестываль скульптуры, яго плануюць на пачатак сакавіка; потым — фестываль жывапісу «Лабірынт», улетку — фестываль манументальна-прыкладнога мастацтва «Манумент», а завершыцца год Трыенале канцэптуальнага мастацтва.

Добрая навіна ёсць і для прыхільнікаў выяўленчага мастацтва ў рэгіёнах Беларусі. Пабачыць работы найлепшых мастакоў, скульптараў змогуць у Полацкай мастацкай галерэі, у Віцебскім цэнтры сучасных мастацтваў, а таксама ў Брэсце і ў Гродне. Як адзначаюць арганізатары, за межамі сталіцы жыве шмат таленавітых людзей і тых, хто цікавіцца творчым жыццём, а гэта трэба падтрымліваць.

**Алена ДРАПКО.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

Застройщик – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей от 27.02.2014 № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А.

Тел./факс: (8017) 361 67 99; (8017) 399 53 91; (8017) 370 84 18, (8044) 785 84 81; (8029) 323 11 11.

Режим работы – приемное время: понедельник, среда с 8.45 до 13.00; вторник, четверг с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1) Жилой дом № 27 по ул. Маршала Лосика.
2) Жилой дом № 29 по ул. Маршала Лосика.
3) Жилой дом № 15 по ул. Юрия Семеняко.
4) Жилой дом № 6 по ул. Маршала Лосика.
5) Жилой дом № 14 по ул. Маршала Лосика.
6) Жилой дом № 4 по ул. Малакович.
7) Жилой дом № 16 по ул. Маршала Лосика.
8) Жилой дом № 23 по ул. Юрия Семеняко.
9) Жилой дом № 21 по ул. Юрия Семеняко.

Застройщиком получены:

- свидетельство (удостоверение) № 500/152-9246 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000006009827;
- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденного председателем Минского городского исполнительного комитета от 30.01.2018;
- заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 10.07.2019 № 291-15/19;
- решение Мингорисполкома от 16.04.2020 № 1219 «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 27.01.2021 № 2-208Ж-003/21;
- договор строительного подряда от 25.01.2021 № 25-01/2021 с ОАО «МАПИД».

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство объекта «Многоквартирный жилой дом № 5/1 по генплану в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 4 (5-я очередь строительства)».

127-квартирный жилой дом запроектирован на базе индустриальных изделий серии М464-М 16-этажным, двухсекционным, с техническим подпольем и чердаком, встроенным на 1-м этаже помещением товарищества собственников (ПТС). В каждой секции запроектированы одна незадымляемая лестничная клетка и два лифта.

Во всех квартирах предусмотрена полная планировка, организованы комнаты, кухни, санузлы, прихожие, места для кладовых или встроенных шкафов, летние помещения.

Внутренняя отделка:

стены – обои (жилые комнаты, прихожие, кухни); акриловая покраска (санузлы);

потолки – акриловая покраска;

полы – керамическая плитка (санузлы); линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове (жилые комнаты, коридоры квартир, кухни, кладовые);

окна – профиль ПВХ, заполнение – стеклопакеты, оснащены детскими замками безопасности и устройствами постоянного притока наружного воздуха;

двери – деревянные.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, преимущественно многодетных семей, по направлениям администраций районов г. Минска:

- 2 (две) однокомнатные квартиры;
- 62 (шестьдесят две) двухкомнатные квартиры;
- 63 (шестьдесят три) трехкомнатные квартиры.

Цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 5/1 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет: для нормативной площади – 1 699,16 бел. рублей; для площади, превышающей нормативную, – 2 100,00 бел. рублей.

Начало строительства – январь 2021 года.

Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – март 2022 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, каб. 101, 102.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента получения договора до 15 процентов от общей стоимости объекта долевого строительства.

Утерянный студенческий билет номер ЛВ0411265, выданный Минским государственным автомеханическим колледжем им. Высоцкого в 2017 году, на имя Апалинского Михаила Игоревича **считать недействительным.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР» 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

**Лот № 1.** Изолированнное помещение с инв. № 200/D-189221 площадью 309,1 кв. м, расположено на 1-м, 2-м, 3-м этажах, наименование – нежилое помещение, назначение – помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/9-1. Изолированнное помещение с инв. № 200/D-189223 площадью 308,3 кв. м, наименование – нежилое помещение, назначение – помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/9-2. Изолированнное помещение с инв. № 200/D-191839 площадью 839 кв. м, наименование – нежилое помещение, назначение – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-12. Примечание: этаж: антресоль, 1-й этаж. Состоит из помещений 1-го этажа площадью 16,7 кв. м, 9,1 кв. м, 10,5 кв. м, 25,4 кв. м, 19,5 кв. м, 22,4 кв. м, 46,3 кв. м; антресоли площадью: 16,0 кв. м, 20,0 кв. м, 14,9 кв. м, 14,5 кв. м, 18,8 кв. м, 7,6 кв. м, 4,0 кв. м, 3,4 кв. м, 343,2 кв. м, 5,6 кв. м, 6,3 кв. м, 6,7 кв. м, 3,8 кв. м, 6,5 кв. м, 4,4 кв. м, 6,3 кв. м, 207,1 кв. м. Местами общего пользования между ИП №№ 7, 5, 6, 3, 4, 2,1 27, 26, 25, 24, 23, 22, 20, 19, 18, 17, 21, 14, 15, 16, 13, 12, 47, 37, 38, 39, 11, 10, 8, 9, 28, 29, 30, 31, 32, 33, 34, 35 являются помещения: на 1-м этаже – тамбур 38,7, вахта 10,2, коридор 360,5, умывальная 18,3, коридор 12,3, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, лестничная клетка 54,6, коридор 28,5, коридор 12,7, лестничная клетка 49,6, кладовая 6,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, умывальная 6,8, коридор 5,0, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, подсобное 5,5, туалет 1,3, туалет 1,3, туалет 1,4, коридор 7,6, коридор 3,1, туалет 9,1, туалет 1,4, туалет 1,3, туалет 6,3, туалет 1,2, туалет 1,1, туалет 1,1, кладовая 5,1, умывальная 1,8, коридор 37,5, лестничная клетка 49,4, кладовая 6,4, коридор 9,2, туалет 1,4, туалет 1,4, туалет 1,4, туалет 1,4, коридор 4,5, умывальная 18,4, коридор 2,6, коридор 70,6; на 2-м этаже – лестничная клетка 56,7; лестничная клетка 55,3, лестничная клетка 56,9, переход 63,8; на 3-м этаже – коридор 44,9, лестничная клетка 56,7, лестничная клетка 55,6, лестничная клетка 56,1 (площади указаны в кв. м). Изолированнное помещение с инв. № 200/D-191842 площадью 1513,1 кв. м, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-47. Состоит из помещений 1-го этажа площадью: 17,0 кв. м, 1496,1 кв. м. Местами общего пользования между ИП № 7, 5, 6, 3, 4, 2,1 27, 26, 25, 24, 23, 22, 20, 19, 18, 17, 21, 14, 15, 16, 13, 12, 47, 37, 38, 39, 11, 10, 8, 9, 28, 29, 30, 31, 32, 33, 34, 35 являются помещения: на 1-м этаже – тамбур 38,7, вахта 10,2, коридор 360,5, умывальная 18,3, коридор 12,3, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, лестничная клетка 54,6, коридор 28,5, коридор 12,7, лестничная клетка 49,6, кладовая 6,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, умывальная 6,8, коридор 5,0, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, туалет 1,1, подсобное 5,5, туалет 1,3, туалет 1,3, туалет 1,4, коридор 7,6, коридор 3,1, туалет 9,1, туалет 1,4, туалет 1,3, туалет 6,3, туалет 1,2, туалет 1,1, туалет 1,1, кладовая 5,1, умывальная 1,8, коридор 37,5, лестничная клетка 49,4, кладовая 6,4, коридор 9,2, туалет 1,4, туалет 1,4, туалет 1,4, туалет 1,4, коридор 4,5, умывальная 18,4, коридор 2,6, коридор 70,6; на 2-м этаже – лестничная клетка 56,7; лестничная клетка 55,3, лестничная клетка 56,9, переход 63,8; на 3-м этаже – коридор 44,9, лестничная клетка 56,7, лестничная клетка 55,6, лестничная клетка 56,1 (площади указаны в кв. м).

**Нач. цена:** 180 190,17 бел. руб. без учета НДС.

**Задаток:** 18 019,01 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторных торгов: 25.02.2021 в 15.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 09.02.2021 с 08.30 по 24.02.2021 до 17.30. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 28.11.2020, 15.01.2021. **Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**. **Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение объекта торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплатить за объект в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта. Возможно предоставление рассрочки оплаты предмета торгов на срок до шести месяцев. **Аукцион проводится** в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 6114046 – Труханович Александр Владимирович.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Капитальное строение, расположенное по адресу:**
**Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114**

| Наименование (назначение) | Инв. номер | Общ. площадь |
|---|---|---|
| **Гаражи на 4 автомашины** (здание нежилое) | 102/С-9461 | 89,3 кв. м |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,0245 га, предоставлен на праве аренды сроком по 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины

**Начальная цена (с НДС 20 %): 8 280,00 белорусских рублей**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 08.00 до 17.00, +375 (33) 673 28 47 (Мизюк Наталья Леонтьевна)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20 (двадцать) рабочих дней** после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также оплатить организатору торгов вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия электронных торгов:** оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Расходы по государственной регистрации перехода прав на объект недвижимости возлагаются на Покупателя

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 17.12.2020

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 10.00 24.02.2021** **Окончание торгов: 12.00 24.02.2021** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.02.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «Вудкойн»** (УНП 692045636) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.

Пятые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **24 февраля 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № | Предмет торгов | Начальная цена, без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Кромкообрезной станок RT4 | 4 125,00 |
| 2 | Горизонтальный ленточнопильный станок HMPS-74 | 1 850,00 |

**Местонахождение –**
**Минская обл., Воложинский р-н, д. Новый Двор.**
**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 10.02.2021 г. 09.00 по 23.02.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов и задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Покупатель осуществляет принятие и демонтаж имущества по месту его нахождения собственными силами и за свой счет. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 16.01.2020 г., 17.12.2020 г., 27.11.2020 г., 14.10.2020 г., 22.08.2020 г., Единый государственный реестр сведений о банкротстве от 21.08.2020 г., 13.10.2020 г., 27.11.2020 г., 16.12.2020 г., 15.01.2021 г.

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 11 марта 2021 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для коллективного садоводства на территории Смолевичского района

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | СТ «Шипяны», 213 | 624882500001000272 | 0,1000 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2400 |
| 2 | СТ «Радуга-4», 392 | 624881700017000321 | 0,0510 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2000 |
| 3 | СТ «Солнечное-08», 128 | 624882000020000141 | 0,0448 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 5000 |
| 4 | СТ «Садовод», 192 | 624881700007000206 | 0,0616 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2400 |
| 5 | СТ «Садовод», 116 | 624881700007000261 | 0,0595 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2400 |
| 6 | СТ «Садовод», 172 | 624881700007000253 | 0,0570 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2400 |
| 7 | СТ «Вектор-2012», 54 | 624882000053000177 | 0,0912 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 15 000 |
| 8 | СТ «Вектор-2012», 85 | 624882000053000095 | 0,0963 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 15 000 |
| 9 | СТ «Вектор-2012», 179 | 624882000053000172 | 0,0921 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 15 000 |

**Аукцион состоится 11 марта 2021 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу:https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

# БЕЗ РАБОТЫ — КОЖНЫ ШОСТЫ

## Чаму Літва б'е рэкорды па беспрацоўі?

**Узровень беспрацоўя ў Літве дасягнуў рэкордна высокага ўзроўню, паведаміла грамадскае літоўскае медыя LRT.lt. Як сведчаць даныя службы занятасці краіны, без работы застаецца каля 277 тысяч жыхароў працаздольнага ўзросту — 16,1 працэнта ад агульнай колькасці рабочай сілы. У параўнанні са снежнем 2020-га беспрацоўе ў Літве вырасла на 0,6 працэнтнага пункта, а ў параўнанні са студзенем мінулага года — гэта значыць з перыядам да пандэміі — прырост склаў амаль палову ад цяперашняга паказчыка — 7,4 працэнта. Чаму Літва б'е рэкорды па беспрацоўі і чаго чакаць надалей?**



### ПЕРАКРЭСЛЕНЫЯ ПЛАНЫ

На фоне пандэміі і агульнага эканамічнага спаду летась у Літве былі заўважаны рэкордныя паказчыкі беспрацоўя. Планы краіны аб выраўноўванні ўзроўняў даходаў былі перакрэслены ўспышкамі пандэміі каранавіруса — спачатку ў красавіку, а пасля і ў верасні. У жніўні ўзровень беспрацоўя ў краіне, паводле інфармацыі службы занятасці Літвы, склаў 13,5 %, а ў верасні — ужо 14,3 %.

Пры гэтым дадзены паказчык працягваў расці, дасягнуўшы ў снежні рэкордных адзнак. Як заўважыў 15min.lt асацыяваны эксперт Літоўскага інстытута свабоднага рынку Лукас Стравінскас, сітуацыя ў сферы занятасці парадаксальная. Меры дзяржавы, накіраваныя на падтрымку людзей без работы, робяць куды больш прывабным атрыманне дапамогі па беспрацоўі, чым працаўладкаванне за зарплату, амаль роўную выплатам. Гэта, на думку эксперта, не стымулюе шукаць рабочае месца. Прычым такая тэндэнцыя была характэрная для літоўцаў яшчэ да пачатку пандэміі, а з увядзеннем абмежаванняў і зусім узмацнілася.




«Па даных Eurostat, гэтыя «пасткі» ў Літве былі большыя ў параўнанні з іншымі краінамі яшчэ да пандэміі, што дорага абыходзіцца не толькі дзяржаўнаму бюджэту, але і самім літоўцам, паколькі страчваюцца навыкі і кампетэнцыя. Вяртацца да работы становіцца ўсё больш складана, расце працяглае беспрацоўе, з якога чалавеку няпроста выбрацца», — растлумачыў Стравінскас.

Нагадаем, што летась дзяржава ўвайшла ў тройку краін ЕС з самым высокім паказчыкам беспрацоўя. Паводле даных Eurostat, Літву апярэдзілі толькі Іспанія і Італія. Цяпер Вільнюс імкліва набліжаецца да сумнага лідарства. «Сітуацыя на рынку працы працягвае няўхільна пагаршацца — беспрацоўе б'е рэкорды», — заўважыў Лукас Стравінскас.

Паводле даных літоўскай статыстычнай службы, колькасць беспрацоўных у краіне працягвае расці. Узровень беспрацоўя вельмі высокі, аднак горшыя прагнозы яшчэ наперадзе, лічыць кіраўнік літоўскай службы занятасці Інга Балнаносіене. «Гэта, вядома, яшчэ не вяршыня гары, але я лічу, што мы павінны будзем дасягнуць піка [беспрацоўя] у лютым», — цытуе Балнаносіене delfi.lt.

Эканаміст банка SEB Тадас Павілаўскас мяркуе, што зарэгістраванае беспрацоўе, магчыма, дасягне піка толькі ў канцы першага квартала. Гэта можна растлумачыць сезоннасцю: звычайна яно расце ў студзені і лютым. «Але да канца першага квартала, у лютым ці сакавіку, я падазраю, што рэкорд будзе пабіты», — выказаў меркаванне эксперт.

Галоўны эканаміст кампаніі па кіраванні актывамі INVLAsset Management Індры Генітэ-Пікчэне адзначыла, што ўся першая палова года для Літвы будзе няпростым перыядам. «У прадпрыемстваў яшчэ не будзе магчымасці вярнуцца да нармальнага рытму і, адпаведна, атрымліваць дастатковы прыбытак ад сваёй дзейнасці для найму людзей і вяртання да нармальнага жыцця, таму ўзровень беспрацоўя можа працягваць расці», — паясніла Генітэ-Пікчэне.

### НА МЯЖЫ ГАЛЕЧЫ

Паводле вынікаў апытання Swedbank, каля 40 працэнтаў рэспандэнтаў «штодня адчувае неспакой з нагоды сваіх фінансаў», а 43 % сцвярджае, што «магчымая страта работы для іх з'яўляецца асноўнай прычынай стрэсу». Між тым 30 % лічыць, што пераважванні з-за грошай негатыўна адбіваюцца на іх адносінах з блізкімі людзьмі, а ў 20 % рэспандэнтаў былі сваркі з-за матэрыяльных пытанняў. Сітуацыю пагаршае і тое, што ў Літве працягваюць расці цэны, якія, на думку жыхароў, неадпаведныя даходам большасці грамадзян. Парадокс заключаецца ў тым, што ўсё гэта адбываецца на фоне агульнаеўрапейскай дэфляцыі.

Кіраўнік Канфедэрацыі прафсаюзаў Літвы Інга Ругінене распавяла, што літоўскія кампаніі і бізнес не заўсёды спраўляюцца са сваімі абавязацельствамі: скарачэнні кадраў працягваюцца, нягледзячы на дзяржаўную падтрымку. Сітуацыя на рынку моцна адбіваецца на ўзроўні жыцця літоўцаў. Маштабы беднасці прымаюць пагрозлівыя формы. Асабліва гэта адбілася на самых небагатых пластах насельніцтва. Цяпер яны літаральна на мяжы галечы, паколькі страцілі крыніцы даходу, не маючы зберажэнняў. За час каранціну патрэба пажылых людзей у дапамозе вырасла ўтрая.

Прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу Літвы правялі акцыі пратэсту з патрабаваннем дазволіць ім аднавіць перапыненую з-за каранціну работу ва ўмовах паляпшэння эпідэмічнай сітуацыі, паведаміла LRT. Каля будынка ўрада ў Вільнюсе і ратушы ў Клайпедзе пратэстоўцы арганізавалі сімвалічныя пахаванні малых прадпрыемстваў. Яны запалілі свечкі і ўстанавілі жалобныя вянкі. Старшыня Савета малога і сярэдняга бізнесу Літвы Даля Матукене заявіла, што пацярпелы бізнес не будзе маўчаць і будзе абараняць свае правы ў судзе.

### ПЕСІМІСТЫЧНЫ СЦЭНАРЫЙ

Дырэктар літоўскага цэнтра сацыяльных даследаванняў Багуслаў Гружэўскі прадставіў два сцэнарыі для Літвы на 2021 год і прааналізаваў выклікі, з якімі сутыкнецца эканоміка краіны. Як лічыць эксперт, цяпер найбольш рэальны песімістычны варыянт развіцця падзей. Ён мае на ўвазе рост беспрацоўя да 20 працэнтаў, разгортванне хвалі эміграцыі, зніжэнне ўзроўню жыцця і рост цэн, заўважыў delfi.lt.

Па словах прафесара, эканоміка і перспектывы жыхароў Літвы сёлета будуць залежаць ад трох фактараў. Першы звязаны з развіццём пандэміі і поспехам вакцынацыі. Другі — са станам сусветнай эканомікі і адпаведнымі зменамі, трэці — з палітычнай стабільнасцю. «Больш за ўсё на нас адбіваецца становішча ў ЕС, таксама ў 2021—2022 гадах вялікае значэнне будуць мець эканамічныя адносіны паміж ЗША і Кітаем. Што да Літвы, многае будзе залежаць ад рашэнняў урада», — адзначыў Гружэўскі.

Па словах эксперта, песімістычны сцэнарый звязаны з магчымым працягам каранціну да мая — у сувязі з чым зацягнецца і эканамічная рэцэсія. «У выніку ў бюджэце будзе адчувальны недахват сродкаў, паколькі знізіцца занятасць, абарот і іншае. Рост беспрацоўя, недахоп сацыяльнай дапамогі, бюджэтных сродкаў знізяць выплаты, не кажучы ўжо аб індэксацыі пенсій, а ў выніку — зніжэнне ўзроўню жыцця і сацыяльнае раз'яднанне», — заўважыў Гружэўскі.

Паводле яго слоў, у рамках песімістычнага сцэнарыя ўзровень беспрацоўя сярод моладзі ў студзені-лютым вырасце да 30 працэнтаў. «З лютага-сакавіка з'явіцца неабходнасць у зніжэнні заробкаў, у першую чаргу ў дзяржсектары. Акрамя таго, павялічыцца доўгатэрміновае беспрацоўе, таксама служба занятасці будзе вымушана ў меншым аб'ёме дапамагаць працаўладкаванню», — прагназуе эксперт.

Што датычыцца змен у сферы дэмаграфіі, то Гружэўскі запэўніў, што тут сітуацыя будзе нязначная. Падчас пандэміі дэмаграфія ў Літве палепшылася, паколькі павялічылася міграцыя, з-за мяжы вярнулася нямала літоўцаў. «Я думаю, будзе расці смяротнасць ад COVID-19 і іншых хвароб. У рамках песімістычнага сцэнарыя прагноз такі, што нам не ўдасца наладзіць належны доступ да паслуг аховы здароўя, таму павялічыцца смяротнасць і ад іншых хвароб. Знізіцца нараджальнасць. Ёсць верагоднасць, што цяпер людзі свядома не будуць нараджаць дзяцей», — дадаў даследчык, заўважыўшы, што гэта прывядзе да скарачэння насельніцтва.

«І самую вялікую небяспеку я бачу ў тым, што граніцы прыадкрыюць, уплыў пандэміі знізіцца, а эканоміка Літвы не зможа хутка аднавіцца. І тут ёсць наступны эфект: з аднаго боку, рост смяротнасці з-за пандэміі, а з другога — у людзей з'явіцца матывацыя з'ехаць дзеля лепшай зарплаты, калі наша эканоміка доўга будзе аднаўляцца. Тады шмат людзей эмігруе», — папярэдзіў эксперт. Песімістычны сцэнарый азначае таксама скарачэнне працягласці жыцця, зніжэнне прывабнасці Літвы для інвестараў.

### РОСТУ ЧАКАЦЬ НЕ ВЫПАДАЕ

Яшчэ ў кастрычніку Літва ўвайшла ў лік краін ЕС з самай высокай рызыкай беднасці. Такую выснову зрабілі эксперты Eurostat, прааналізаваўшы даныя за 2019 год, згодна з якімі больш за чвэрць насельніцтва краіны падвяргалася рызыцы беднасці або сацыяльнай ізаляцыі. Цяжка ўявіць, да якіх высноў прыйдуць эксперты ў выніку аналізу паказчыкаў за 2020-ы, заўважае baltnews.lt. Відавочна, што меры, якія прымаюцца кіраўніцтвам прыбалтыйскіх дзяржаў па павышэнні дабрабыту насельніцтва, можна лічыць неэфектыўнымі. Прычым улады, падобна, слаба звяртаюць увагу на існуючыя ў краіне эканамічныя праблемы. Прынамсі, ім больш цікава дагаджаць просьбам ЗША і НАТА, павялічваючы фінансаванне ваеннай сферы, бесперапынна апраўдваючы свае дзеянні фантомнай «расійскай пагрозай», адзначае baltnews.lt. Так, напрыклад, Літва, нягледзячы на негатыўныя наступствы каранавіруса для эканомікі, плануе павялічыць свае абаронныя выдаткі да ўзроўню 2,5 працэнта ВУП да 2030 года.

Паводле апошняга эканамічнага прагнозу Swedbank, «нягледзячы на тое, што навіны аб вакцынах абнадзейваюць, працэс вакцынацыі будзе павольны, і большасць абмежаванняў на эканамічную актыўнасць, верагодна, захаваецца на працягу першага квартала гэтага года. Апошняе прыводзіць да перагляду тэмпаў росту ВУП у бок паніжэння ў 2021-м». Згодна з прагнозам літоўскага банка SEB bankas, напрыклад, сёлета Літва сутыкнецца з эканамічным спадам на 8,7 працэнта. Іншымі словамі, чакаць бурнага эканамічнага росту ў 2021 годзе не выпадае.

Сёння нават адносна аптымістычныя прагнозы рэдагуюцца ў бок больш песімістычнага сцэнарыя. Аднак менавіта такога развіцця падзей і варта чакаць, калі ўлады больш клапоцяцца аб павелічэнні выдаткаў на абарону, чым аб падтрымцы малога і сярэдняга бізнесу, росце фінансавання медыцынскай і сацыяльнай сфер. Відавочна, краіны Балтыі і раней з'яўляліся адны мі з самых бедных у ЕС, адзначыў baltnews.lt, аднак цяпер пандэмія каранавіруса разам з неэфектыўнай палітыкай улад канчаткова замацавала за імі гэты статус — і, падобна, надоўга.

**Пётр ДУНЬКО.**

• **У тэму**

## Вяршыня крывадушнасці

**Рашэнне Бруселя і Вільнюса датычна работы санаторыя «Беларусь» у Друскінінкаі — гэта вяршыня крывадушнасці і двудушнасці. Пра гэта заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ падчас пасяджэння Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД, перадае карэспандэнт БелТА.**

Па словах міністра, беларускі бок працягвае адсочваць сітуацыю. «Некаторы час таму, калі з боку нашых еўрапейскіх партнёраў зайшла гаворка пра тое, што трэба ўвесці санкцыі ў адносінах да Беларусі, выразна гучала думка, што гэтыя санкцыі не павінны аказаць уплыў на простага чалавека, народ Беларусі, прадстаўнікоў іншых краін. Што мы бачым сёння: гэтыя 350 чалавек, грамадзян Літвы, апынуліся ў бяспраўным стане», — звярнуў увагу Уладзімір Макей. Ён заўважыў, што супрацоўнікам санаторыя прапануюць знайсці новую работу — у 12-тысячным горадзе, дзе ўжо дзве тысячы беспрацоўных.

«Для мяне гэта вяршыня крывадушнасці і двудушнасці: з аднаго боку, заяўляюць аб неабходнасці абароны правоў чалавека, з другога боку, прымаюцца рашэнні, каб стварыць негатыўную сітуацыю для шараговых грамадзян, і такім чынам нібыта выклікаць пратэсны настрой у адносінах да ўлад у Беларусі. Абсалютна крывадушны і двудушны падыход», — падкрэсліў міністр.

«Беларускія «гастралёры», якія раз'язджаюць па еўрапейскіх гарадах і вёсках, заклікаюць да ўвядзення чарговых санкцый супраць краіны і беларускага народа. Калі паўстала гэтая сітуацыя з санаторыем у Друскінінкаі, яны адразу ж паспрабавалі адхрысціцца: «Не, гэта ўлады Беларусі вінаватыя, мы тут ні пры чым». Тэатр абсурду», — так ахарактарызаваў гэтыя дзеянні Уладзімір Макей.

Ён таксама заявіў пра спробы адкрытай хлусні з боку літоўскіх суседзяў. У Літве заяўляюць, што санаторый летась не працаваў з-за пандэміі. Але, паводле інфармацыі міністра, там прайшло аздараўленне васьмі тысяч грамадзян, з іх 1,5 тысячы дзяцей, сярод якіх амаль 200 — дзеці-інваліды.

Прэм'ера рубрыкі

# Храмы маёй Радзімы

**Сёння мы пачынаем незвычайнае падарожжа па нашай Беларусі. Падарожжа, шлях якога будуць пазначаць храмы... Тыя, якія былі ў жыцці кожнага з нас. Бо, дзе б ты ні нарадзіўся — у горадзе, мястэчку, вёсцы, — у цябе знойдуцца ўспаміны, звязаныя з храмамі, альбо з іх руінамі, ці хаця б легендамі пра іх, што распавядалі бабулі, дзядулі, суседзі...**

*«Але дзень настае, калі раптам*
*На світанні, нібыта праз сон,*
*З даляў блакітных мы чуем*
*Ціхі падводны звон.*
*Гэта значыць,*
*што з вежаў нябачных,*
*Праз світанак*
*над мокрай лазой*
*Клічуць жывых супакутваць*
*Званы ў прадоннях азёр...»* —

так пачынаў Уладзімір Караткевіч эсэ «Званы ў прадоннях азёр», галоўным вобразам абраўшы зніклыя, забытыя беларускія храмы, якія берагуць гістарычную памяць.

А гісторыя наша адметная і тым, што Беларусь заўсёды была мультыкультурнай, шматканфесійнай.

У адным мястэчку тут можна было сустрэць і касцёл, і царкву, і сінагогу, і мячэць, і пратэстанцкі збор. Месцічы розных веравызнанняў прыходзілі на адзін кірмаш на цэнтральным пляцы, разам бараніліся ад нападаў ворагаў і разам працавалі дзеля дабрабыту гэтай зямлі.

Беларускія храмы адлюстравалі мудрасць нашых продкаў, іх пачуццё прыгожага і імкненне да святла... Беларускія храмы падзялялі трагічны лёс народа. Іх руйнавалі, іх палілі, мянялі іх прызначэнне... І зноў адналялі.

У новай рубрыцы «Храмы маёй Радзімы» беларускія літаратары падзеляцца сваімі ўспамінамі, разважаннямі, паведамяць цікавыя факты пра храмы свайго жыцця... А мы з вамі атрымаем магчымасць наведаць розныя куточкі нашай Бацькаўшчыны, убачыць іх вачыма незвычайных апавядальнікаў, зрабіць шмат адкрыццяў.

Запрашаем далучыцца да гэтага праекта ўсіх ахвотных, хто мае чым падзяліцца пра храмы сваіх родных мясцін. Чакаем вашых аповедаў. А пакуль — у добры шлях!

## СПАСА-ЕФРАСІННЕЎСКІ МАНАСТЫР, *г. Полацк*

# «Белая цэркаўка тоненькай свечкай...»





www.sb.by

Проста за нашай хатай было поле. Па шырокай сцяжыне праз яго можна было дайсці напрасткі амаль да самай брамы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Сілуэты купалаў цэркаўкі Спаса і Крыжаўзвіжанскай царквы можна было бачыць у добрае надвор'е. Але калі ісці «цывільным» шляхам — па дарозе, дзе ходзяць людзі і машыны, трэба было прайсці праз наш Шосты завулак Фрунзэ, павярнуць налева і далей, міма лясного тэхнікума, проста пад арку, каб можна было трапіць на тэрыторыю манастыра.

У гады майго дзяцінства ніякага манастыра там не было. У завулку яшчэ можна было ўбачыць манашак, што не паехалі разам з усімі, калі манастыр ліквідавалі. Гэта былі старыя жанчыны, і кватаравалі яны ў такіх жа бабулек, што жылі тут. Непадалёк жыў у сваім доме святар, унук якога быў маім равеснікам. Дзе ён вучыўся, я не ведаю, бо нашы сцежкі ніколі не перасякаліся, і я практычна быў, як і мае сябры, з ім не знаёмы.

Увогуле, і манастыр, і царква, у якую хадзілі вернікі з усяго горада, для нас былі тэмай забароненай, як і ўсё, што звязана з рэлігіяй. Памятаю, як перад дзіцячым сеансам у кінатэатры паказвалі дакументальны фільм са страшнымі чорнымі папамі і манахамі, якія рабілі нешта нядобрае. А ў лясным тэхнікуме, які стаяў побач з манастыром (дарэчы, у наш час мы даведаліся, што гэта было калісьці епархіяльнае вучылішча), рэгулярна праводзіліся антырэлігійныя мерапрыемствы.

Таму калі сябрук дзяцінства Лёшка, які жыў зусім побач з манастыром, аднойчы, па-загаворніцку падміргнуўшы, прапанаваў схадзіць паглядзець, што ж там робіцца, я пачаў аднекваць. Але сябрук угаварыў, і мы не праз браму, а з боку рэчкі Палаты прабраліся да самага царкоўнага пляца. Гэты быў летні дзень, і каля царквы Спаса праста на зямлі сядзелі паломнікі. Пазней мы даведаліся, што яны прыйшлі і прыехалі сюды ў дзень памяці святой Ефрасінні Полацкай. Гэта былі ў асноўным старыя людзі, небагата апранутыя, з катомкамі і валізкамі, што выдавала іх дальнюю дарогу. Некаторыя расклалі на траве няхітрыя ссабойкі — вараныя яйкі, сала, свежую цыбулю. Лёшка ўхітрыўся сцягнуць у некага пару яек, я на яго насварыўся, і мы ўцяклі адтуль.

Неўзабаве нам з мамай ад нашага прыгараднага саўгаса далі кватэру, і мы перасяліліся пад самы манастыр, насупраць лясного тэхнікума. Дарэчы, яшчэ бліжэй да брамы жыла сям'я Пятра Васючэнкі, з якім нас потым звёў жыццёвы і творчы лёс.

Цяпер я часта хадзіў да Палаты, на падвесны масток праз гэту вірлівую рэчачку, з якога цэркаўка Спаса была як свечачка ў зяляніне дрэў, і нейкае дзіўнае святло ішло ад яе, і хацелася ўсё глядзець і любавацца гэтай прыгажосцю.

Спаруда Крыжаўзвіжанскага храма была скалечана і зазяла расколінамі і пустымі званіцамі. А вакол, у манастырскіх пабудовах, жылі людзі, проста перад храмам сталі хлеўчукі для парсючкоў, з калонкі насілі ваду.

Гэта быў так званы маласямейны інтэрнат. Добра памятаю вайсковага старшыну дзядзю Мішу, які, падпіўшы, з нязменнай цыгарэтай у зубах, выходзіў з гармонікам на пляц і спяваў пахабныя прыпеўкі.

Не ведаю я яшчэ тады, што ў адной з келляў пасяліцца на кватэру мая будучая жонка, якая прыехала з «Артэка», дзе працавала піянерважатай, да сяброўкі ў госці, ды так і засталася ў Полацку. Цяпер, калі я гляджу на адну з манастырскіх пабудоў, успамінаю вузкі калідор, дзверы, невялікі пакойчык, у якім разам з пажылой гаспадыняй кватаравала мая Марыя Іванаўна.

Але гэта было пазней, а тады мяне, дзевяцікласніка, усё больш цягнула да бялюткай цэркаўкі, да дзівоснай цішыні, дзе чуваць было толькі, як віруе палатоўская жоўтая вада. Нядаўна на адна з чытачак запытала, чаму, калі я пішу пра Палату, заўсёды называю яе ваду жоўтай. Адказ вельмі просты: пясчаное дно, пясчаны бераг, таму і жоўтая вада. Сёння маю ўлюбёную рэчачку, як той казаў, вераб'ей можа перайсці, а мы ж у ёй нават купаліся.

Атэістычная прапаганда вяла бязлітасную барацьбу з «цемрашальствам». На ўсе святы на тэрыторыі былога манастыра дзяжурыў камсамольскі патруль. Асабліва пільна ён угледзаўся ў тых, хто прыходзіў сюды ў Велікодную ноч. Гэта надавала нам пэўнага драйву, і мы прызначалі спатканні менавіта там. Аднойчы нас «засеклі», бо мы нават зайшлі ў царкву, назаўтра былі размова і «сяброўскае ўшчуванне».

Пазней, калі я працаваў карэктарам у полацкай газеце, наш намеснік галоўнага рэдактара, будучы пісьменнік Герман Кірылаў напісаў невялікую нататку пра Ефрасінню Полацкую, адзначыўшы яе асветніцкую ролю.

Падняўся такі вэрхал у мясцовых чыноўніцкіх колах!.. Германа нават хацелі звольніць з работы, толькі калі за яго заступіліся адначурснікі па ўніверсітэце, прыйшоў ліст з Акадэміі навук, «справу» спусцілі на тармазах.

Хто мог тады ўявіць, што мая родная вуліца будзе насіць імя Ефрасінні Полацкай, што яе імя зазіхаціць яснай зоркай для ўсіх беларусаў!

І вось прыйшоў той памятны семдзесят пяты год, калі я амаль кожны вечар праходзіў паўз маўклівы жах Крыжаўзвіжанскай царквы, паўз свечачку цэркаўкі Ефрасінні, адкуль прывяду ў хату да бацькоў сваю маладую жонку.

Ці не цуд гэта? Аднойчы мы з сям'ёй сталі і да службе ў аднаўленым Крыжаўзвіжанскім храме, і да мяне падышла адна з царкоўных жанчын.

— Мы ведаем вас, мы памятаем вас, чытаем вашы вершы. Вы ж наш, палачкі.

Гэта былі адны з самых кранальных слоў, якія я чуў у свой адрас. І тады я пайшоў у суседнюю, маленькую, але заўсёды жывую цэркаўку Спаса, закладзеную яшчэ па волі самой Ефрасінні.

Што я шаптаў тады, гледзячы на купал, пад якім была яе маленькая келля, пад позіркамі старажытных фрэсак, якія прыйшлі да нас праз напластаванні вякоў, аж з дванаццатага стагоддзя, не скажу нікому. Але прызнаюся, што сярод гэтых шчырых слоў была і згадка з майго даўняга верша:

*Веі замружу,*
*і ўбачыцца вечар —*
*Белая цэркаўка*
*тоненькай свечкай.*
*Гнёзды шпачыныя*
*над Палатой.*
*Цені дубоў над халоднай*
*вадой.*

*А за стагоддзямі*
*ў прыцемку сінім*
*Вочы зямлячкі маёй,*
*Еўфрасінні.*
*Цьмяна бялее*
*на кнізе рука,*
*Б'ецца аб шыбу*
*агонь матылька.*

*Полацк драўляны,*
*малінавы звон...*
*Хто ты? Ці мроя, ці ява,*
*ці сон?*
*Можа, твой майстар*
*на холад мурой*
*Выплесне здолей*
*гарачую крой,*

*Позірк праменны,*
*дыханне надзей,*
*Каб засталося святло*
*для людзей?*
*Што ты хацела*
*на роднай зямлі?*
*Ды цішыня. І стагоддзі*
*прайшлі.*

*Толькі вось цэркаўкі*
*белы пажар.*
*Толькі аблокаў*
*павольных цяжар.*
*Толькі прымроіцца*
*ў прыцемку сінім*
*Позірк зямлячкі маёй,*
*Еўфрасінні.*



**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Спадчына

# МІСІЯ: ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ

## Гады малой радзімы і права на памяць

**За 2018—2020 гады, якія ў нашай краіне прысвячаліся малой радзіме, у краіне было адрэстаўравана або прыстасавана пад новыя функцыі больш за 400 гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Сярод іх будынак музея Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве, царква ў вёсцы Сынкавічы Зэльвенскага раёна, аб'екты мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», паўночна-ўсходняя вежа Лідскага замка, мемарыяльны комплекс «Прарыў» ва Ушацкім раёне , абеліск «Мінск — горад-герой», будынак кінастудыі «Беларусьфільм», стадыён «Дынама», помнік гісторыі «Трасцянец», будынкі фабрыкі-кухні і філіяла Дзяржаўнага музея Максіма Багдановіча «Беларуская хатка» ў Мінску, сталічны манумент Перамогі, мемарыяльны комплекс «Рыленкі», музей пад адкрытым небам «Стаянка першабытнага чалавека» ў аграгарадку Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці і шмат якія іншыя. Інфармацыя пра гэта прагучала на прэс-канферэнцыі ў прэс-цэнтры БелТА, прысвечанай пытанням захавання, прымнажэння і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.**

### ДЗЯРЖСПІС ПАШЫРЫЎСЯ

Шмат увагі аддавалася падрыхтоўцы і разгляду прапаноў аб пашырэнні Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцяў. У выніку за 2018—2020 гады Дзяржспіс папоўніўся 53 новымі аб'ектамі. І на сёння, як паведаміла **начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталля ХВІР,** туды ўключана 5596 аб'ектаў.

Летась Міністэрствам культуры створаны пошукавы сайт, які дазваляе любому карыстальніку хутка знаходзіць інфармацыю аб гісторыка-культурных каштоўнасцях, у тым ліку праз мабільную праграму. Таксама Дзяржаўны спіс размешчаны на афіцыйным сайце Міністэрства культуры і ў інфармацыйна-прававой сістэме «Эталон». Дзяржава прыкладае ўсе намаганні, каб не толькі захаваць і прымножыць гісторыка-культурныя каштоўнасці, але і пашыраць веды пра нацыянальныя здабыткі.

За апошнія гады Міністэрствам культуры сумесна з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі праведзена работа па арганізацыі выплаты адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Згодна з указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 527, у Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва паступіла ў 2018 годзе больш за 700 тысяч рублёў, у 2019 годзе больш за 900 тысяч, у 2020 годзе больш за 1 мільён 280 тысяч рублёў. У 2018 годзе за кошт сродкаў Фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва праведзены работы па кансервацыі з рэстаўрацыяй фрагментаў замка ў аграгарадку Крэва, кансервацыя з фрагментарнай рэстаўрацыяй руін былога замка Сапегі ў Гальшанах, рэстаўрацыйныя работы палацава-паркавага ансамбля Пуслоўскіх у Косаве. У 2019 годзе праводзіліся работы па аднаўленні радавога маёнтка Напалеона Орды ва ўрочышчы Чырвоны Двор Іванаўскага раёна, былы касцёл езуітаў у Мсціславе, пахавальная капліца Паскевічаў у Гомелі, Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку. У 2020 годзе ўдалося цалкам стабілізаваць тэхнічны стан касцёла ў Мсціславе, праведзены супрацьаварыйныя і кансервацыйныя работы на паўночна-ўсходнім корпусе Гальшанскага замка, выкананы работы па аднаўленні часткі сцяны, прылеглай да Княжацкай вежы Крэўскага замка, працягваліся работы на іншых ключавых аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны.

Вяліся работы і ў Жыровічах, аднаўлена гістарычнае аблічча званіцы Свята-Успенскага манастыра. Асаблівая ўвага аддаецца аднаўленню палаца роду Булгакаў XIX стагоддзя ў аграгарадку Жылічы Кіраўскага раёна, які вядомы багатымі інтэр'ерамі. На Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку працягнуліся ўнікальныя работы, у тым ліку па раскрыцці фрэскавага роспісу XII стагоддзя. Дарэчы, работа на гэтым аб'екце будзе працягвацца да 2024 года.

Работа Міністэрствам культуры вядзецца таксама ў кірунку павелічэння прысутнасці беларускіх аб'ектаў у спісах сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Так, у 2018 годзе ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўключаны элемент урачыстасці ў гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай (так званы Будслаўскі фэст Мядзельскага раёна). У снежні 2019 года міжурадавым камітэтам па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны прынята рашэнне аб уключэнні ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны вясновага абраду «Юраўскі карагод» з вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна. У снежні 2020 года прынята рашэнне аб уключэнні беларуска-польскай намінацыі «Культура бортніцтва Беларусі і Польшчы».

На працягу 2020 года завершана дасье па элементце нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны «Саломапляценне Беларусі: мастацтва, рамяство, уменні». Цэнтрам культурнай спадчыны ЮНЕСКА ў чэрвені 2020 года ўзгоднена ініцыятыва Міністэрства культуры па культурным праекце «Мусульманская спадчына Цэнтральнай Еўропы», якім прадугледжана аб'яднаць намаганні на міжнародным, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях для вывучэння патэнцыялу мусульманскай культурнай спадчыны. Інфармацыя аб праекце размешчана на афіцыйным сайце ЮНЕСКА.



Такі палац Булгакаў у Жылічах бачыў калісьці Напалеон Орда. Цяпер вядзецца работа, каб унікальнаму ансамблю вярнуць былыя славу і веліч.

### СТАЛІЧНЫЯ НАБЫТКІ

Па Мінску ў Дзяржаўны спіс уключана 480 гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Але калі ўлічыць, што многія аб'екты аб'яднаны ў адзіныя комплексы, то атрымаецца значна большая лічба. Так, у сталіцы знаходзіцца больш за 1500 аб'ектаў — рухомых і нерухомых, матэрыяльных і нематэрыяльных.

Гэта ў тым ліку больш за 380 помнікаў горадабудаўніцтва, архітэктуры, археалогіі, мастацтва, гісторыі. А таксама 27 рухомых каштоўнасцяў — музейныя калекцыі, рукапісныя і старадрукаваныя кнігі, якія знаходзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы, Нацыянальным мастацкім музеі і будынку Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

У 2020 годзе ў Дзяржспіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў па горадзе Мінску быў уключаны такі нематэрыяльны аб'ект, як мастацкія практыкі саломапляцення. Так, у сталіцы, як і ў іншых рэгіёнах, ёсць высокапрафесійныя майстры, якія ствараюць незвычайныя мастацкія творы з саломы.

Шмат намаганняў прыкладаецца, каб падтрымліваць аб'екты спадчыны ў належным стане. У 2020 годзе ў Мінску больш чым на 60 аб'ектах праходзілі рамонтна-рэстаўрацыйныя работы, і на 34 з іх ужо завершаны. Агульны аб'ём асвоеных сродкаў — больш за 66 мільёнаў рублёў (у тым ліку з рэспубліканскага бюджэту 25 мільёнаў, са сродкаў мясцовага бюджэту 25 мільёнаў і за кошт інвестараў больш за 16 мільёнаў).

Летась завершаны такія важныя работы, як рамонт з рэстаўрацыяй манумента Перамогі, рэстаўрацыя манументальных мазаік «Горад-герой» і «Горад-воін» на жылых будынках мікраёна Усход-1, рэканструкцыя і добраўпарадкаванне парка імя Янкі Купалы. Рамонт з рэстаўрацыяй, рэканструкцыя праведзены на будынках па вуліцах Кірава, Карла Маркса, Энгельса, Мяснікова. Таксама праведзены рамонты розных элементаў — дахаў, памяшканняў — дамоў на вуліцах Карла Маркса, Першамайскай, Савецкай, на праспекце Незалежнасці.

Працягваюцца работы па аднаўленні і добраўпарадкаванні пабудоў гістарычнага цэнтра. Зараз яны вядуцца ў Ракаўскім прадмесці.

У 2021 годзе ў інвестыцыйных праграмах горада Мінска прадугледжаны таксама сродкі на рэканструкцыю, рэстаўрацыю аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Працягнуцца работы на вуліцах Ракаўскай і Інтэрнацыянальнай. У Лошыцкім сядзібным комплексе запланавана правесці кансервацыю будынка бровара. Пачнецца рэканструкцыя з рэстаўрацыяй кінатэатра «Перамога». Выдзелены сродкі на рэстаўрацыю храма Аляксандра Неўскага, што знаходзіцца на тэрыторыі Вайсковых могілак.

Як паведаміла **начальнік аддзела мастацтваў упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама Наталля СМОЛЬСКАЯ,** па Мінску распрацавана 68 праектаў зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцяў, і гэта работа будзе працягвацца.

### АРХЕАЛАГІЧНАЯ КАРТА

Пра неабходнасць стварэння археалагічнай карты Мінска згадаў **дырэктар Інстытута гісторыі НАН Вадзім ЛАКІЗА.** Гэта комплексная работа дазволіла б і захоўваць, і папулярызаваць спадчыну. «Археалагічная карта паказвае тысячагадовую гісторыю Беларусі, — заўважыў Вадзім Леанідавіч. — Мы ведаем аб з'яўленні першых людзей на тэрыторыі цяперашняга горада ў эпоху мезаліту, напрыклад, на тэрыторыі парку Чалюскінцаў. Знаходкі былі і каля гасцініцы «Беларусь». У раёне Лошыцкага парку знойдзены помнікі археалогіі, характэрныя для жалезнага веку, ранняга Сярэднявечча. Тэрыторыя засялялася і ў IX—X стагоддзях, найбольш актыўна — у эпоху Сярэднявечча»

Натуральна, такая інфармацыя можа выкарыстоўвацца і ў турыстычных мэтах, у адукацыйным працэсе, карысная яна будзе для інвестараў, якія атрымліваюць участкі пад забудову. Яшчэ адна ідэя, вартая ўвагі, — стварэнне на тэрыторыі парку Чалюскінцаў (дзе знойдзены старажытныя матэрыялы) і батанічнага сада міні-музея, дзе можна было б даведвацца пра цікавінкі з гісторыі горада і незвычайныя знаходкі, тут выяўленыя.

### ПАШЫРЭННЕ ВЕДАЎ

Між іншым, прыклады таму, як можна падаваць старажытную гісторыю, ужо ёсць. Так, у Белавежскай пушчы пад адкрытым небам створаны музей, які дазваляе паглыбіцца ў розныя эпохі, дакрануцца да прадметаў, якімі карысталіся людзі ад каменнага веку да эпохі Сярэднявечча.

Інстытут гісторыі НАН займаецца не толькі навуковымі даследаваннямі, але і ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» распрацоўкай мер па ахове археалагічнай спадчыны. За 2020 год Інстытут выдаў 612 заключэнняў аб наяўнасці ці адсутнасці на тэрыторыі земляных работ аб'ектаў ці помнікаў археалогіі для 241 арганізацыі і юрыдычных асоб з усіх абласцей Беларусі. Акрамя таго, у 2020 годзе Акадэмія навук выдала 216 дазволаў на правядзенне археалагічных даследаванняў па ўсіх абласцях і горадзе Мінску. Напрыклад, у 2019-м было выдадзена 220 дазволаў. Невялікае памяншэнне звязана выключна з эпідэмічнай сітуацыяй — летась у сувязі з мерамі бяспекі была зменшана колькасць экспедыцый са школьнікамі і студэнтамі. Хоць рабоце з падрастаючым пакаленнем у Інстытуце аддаецца асаблівая ўвага. За Гады малой радзімы разам з юнымі даследчыкамі археалагічныя лагеры праводзіліся ў Дзятлаве, Гальшанах, Бешанковіцкім і Шэрагу іншых раёнаў.

Сумесна з мясцовымі органамі ўлады навукоўцы за тры гады правялі 14 канферэнцый, у якіх разам з вучонымі ўдзельнічалі школьнікі, студэнты, краязнаўцы, мясцовыя супрацоўнікі аддзелаў культуры, настаўнікі. Такія сустрэчы, накіраваныя ў першую чаргу на вывучэнне і папулярызацыю рэгіянальнай гісторыі, прайшлі ў Шклове, Дзятлаве, Ашмянах, Акцябрскім, Расонах, Іўі, Глыбокім, Лідзе і г. д.

Па выніках выходзяць зборнікі з каштоўнай інфармацыяй, варта адзначыць і серыю, якая выдаецца Інстытутам гісторыі, «Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі».

Але знаёміць з гісторыяй людзей можна і праз... паслугі. У рэстаўраваных аб'ектах могуць быць не толькі музеі. І прыклады таму ўжо ёсць у Мірскім, Нясвіжскім замках і іншых аб'ектах. Пры стварэнні таго ж музея пад адкрытым небам у Белавежскай пушчы было пакінута месца для правядзення фестываляў: у нашай краіне багата рэканструктараў і рамеснікаў, гатовых прыязджаць на такія пляцоўкі і прапаноўваць там сваё паслугі і тавары. На базе гістарычных аб'ектаў працуюць і гатэлі, напрыклад у сядзібе Агінскага ў Залессі можна прыпыніцца на начлег і паглыбіцца ў атмасферу, у якой жыў і твbooўў наш славуты зямляк.

Цяпер аднаўляецца палацава-паркавы комплекс Свяцк, акрамя музея, там будуць гасцініца, аздараўленчы комплекс, рэстаран. Калі ўлічыць, што комплекс знаходзіцца па дарозе да Аўгустоўскага канала, можна меркаваць, што ўсе гэтыя паслугі будуць запатрабаваныя.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

